Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне
ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЫ

Навукова-творчы калектыў
«Беларуская школа – XXI стагоддзе»

# Літаратура і мастацтва
# Геаграфія
# Беларускі фальклор

*Эксперыментальныя аўтарскія праграмы*
*гуманітарнага ліцэя*

Выпуск чацвёрты

Мінск
2017

УДК 37.01
ББК 74.26
Л64

**Літаратура** і мастацтва; Геаграфія; Беларускі фальклор : экспе-
Л64 рыментальныя аўтарскія праграмы гуманітарнага ліцэя. — Мінск : Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Таварыства беларускай школы», 2017. — 96 с.

Зборнік аб'ядноўвае эксперыментальныя навучальныя праграмы курсаў па літаратуры і мастацтве; глабальных праблемах чалавецтва; беларускім фальклоры для гуманітарнага ліцэя, складзеныя іх аўтарамі і выкладчыкамі.

Рэкамендуецца педагогам сярэдніх навучальных устаноў гуманітарнага профілю.

**ББК 74.26**
**УДК 37.01**

© Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Таварыства беларускай школы», 2017.

# АЎТАРСКАЯ ПРАГРАМА

вывучэння курса

## Літаратура і мастацтва

*у гуманітарным ліцэі*
*з беларускай мовай навучання*

Складальнік:
*Лявон Баршчэўскі,*
кандыдат філалагічных навук,

# УСТУП

## Літаратура і мастацтва як дысцыпліна ў гуманітарным ліцэі

***Да гісторыі пытання.*** З савецкіх часоў у беларускіх сярэдніх і вышэйшых навучальных установах існуе штучны падзел літаратурнай і мастацкай адукацыі, абумоўлены, відавочна, неабходнасцю ажыццяўлення імперскай палітыкі ў дачыненні да «малых» народаў Расійскай імперыі і постсавецкай прасторы. Неабходнасць паслядоўнага ажыццяўлення палітыкі русіфікацыі на савецкіх і, па магчымасці, на постсавецкіх прасторах патрабавала пастаяннага сцвярджэння абсалютнага дамінавання рускай нацыі, рускай мовы ў грамадскім, а з часам і ў прыватным жыцці. Прыкладам, праз увядзенне абавязковага прадмета «русская литература», на які ў вучэбных планах адводзілася істотна большая колькасць гадзін, чым на літаратуры нацыянальныя, вялікі патэнцыял класічнай расійскай літаратуры ў савецкіх школах, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах быў пастаўлены на службу савецка-імперскай палітыцы. Цэлым пакаленням савецкіх людзей змалку ў галовы паслядоўна ўводзілася думка, што «сапраўдныя» мастацтва і літаратуру стваралі Андрэй Рублёў, Мацвей Казакоў, Дзмітрый Лявіцкі, Міхайла Ламаносаў, Дзмітрый Фанвізін, Аляксандр Грыбаедаў ці Жукоўскі, а да прыкладу, творчасць Грыгора Нарэкацы, Шата Руставелі, Нізамі, Францыска Скарыны, Яна Бернардоні ці Міхала Казіміра Агінскага – гэта адно «нацыянальна-этнаграфічны», «чужынскі» да адзіна вялікай і гуманістычнай, «нашай» расійскай культуры.

Вельмі абмежаваным, а ў шэрагу выпадкаў зведзеным практычна да нуля, у савецкай школе было вывучэнне твораў замежнай літаратуры: да адзінкавых твораў Шэкспіра або Гётэ далучалі не самай лепшай якасці літаратурныя практыкаванні расійскіх пісьменнікаў XVIII стагоддзя. Вывучэнне літаратуры ў савецкай сярэдняй школе было часткай адпаведнай ідэалагічнай індактрынацыі моладзі, у падмурку якой ляжаў усё той жа вялікарасійскі дзяржаўны шавінізм.

Працэсы набыцця рэспублікамі Савецкага Саюза суверэннага і незалежнага статуса, што мелі месца ў канцы 80-х – пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя, непазбежна вялі да разумення таго, што такое становішча з літаратурнай і мастацкай адукацыяй мусіць быць зменена, прычым зменена карэнным чынам. Стварэнне ў 1990–1991 гг. гуманітарнага ліцэя з беларускай мовай навучання пад эгідай міністэрства адукацыі дало магчымасць педагогам ліцэя працаваць над уласнымі, аўтарскімі праграмамі па гуманітарных дысцыплінах. Выкладчыкі ліцэя, кандыдат філалагічных навук, тагачасны навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры Акадэміі навук Беларусі Пятро Васючэнка, а таксама настаўнік Алег Дышлевіч распрацавалі праграмы па двух асобных дысцыплінах, «Літаратура народаў свету» і «Беларуская літаратура», якія на пачатку 1992 г. былі зацверджаныя Міністэрствам адукацыі ўжо незалежнай Рэспублікі Беларусь для выкарыстання ў ліцэі Беларускага гуманітарнага адукацыйна-культурнага цэнтра і яго філіях у Гродне, Брэсце, Магілёве, Гомелі, Светлагорску, Дзяржынску і Наваполацку. Праца па гэтых праграмах дазволіла назапасіць неабходны досвед і перайсці да распрацоўкі сінтэтычнага курса «Літаратура», у стварэнні якога прымалі ўдзел, побач за згаданым Пятром Васючэнкам, таксама аўтар гэтай праграмы, загадчык сектара тэорыі літаратуры Інстытута літаратуры Акадэміі навук кандыдат (цяпер доктар) філалагічных навук і малодшы навуковы супрацоўнік таго самага Інстытута

(цяпер кандыдат філалагічных навук) Ігар Шаладонаў. Гэтая праграма, зацверджаная Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у 1995 і 2001 гг., збольшага застаецца актуальнай і па сённяшні дзень: на яе падставе распрацаваны гэты варыянт. Вышэйзгаданыя педагогі Беларускага гуманітарнага ліцэя ў другой палове 1990-х гадоў удзельнічалі ў распрацоўцы канцэпцыі літаратурнай адукацыі ў ліцэях і гімназіях для 12-гадовай сярэдняй школы і распрацавалі адпаведныя праграмы сінтэтычнага курса літаратуры, якія, аднак, у канчатковым выніку не былі ўведзеныя ва ўжытак па-за Беларускім гуманітарным ліцэем (а пазней канцэпцыя 12-гадовай сярэдняй адукацыі была наогул пахаваная з ініцыятывы ўладных структур).

Трэба таксама адзначыць, што курс літаратуры ў грамадскім Беларускім гуманітарным ліцэі традыцыйна выкладаецца ў цесным спалучэнні з курсам айчыннай і сусветнай мастацкай культуры, які – у асноўных рысах – грунтуецца на адпаведных праграмах, створаных выкладчыкамі Беларускага гуманітарнага ліцэя Вячаславам Ракіцкім, Вольгай Дадзіёмавай у 1991–1992 гг., а таксама Нацыянальным інстытутам адукацыі ў 1997–2006 гг. Практыка выкладання дысцыплін «Літаратура» і «Мастацкая культура» ў спалучэнні на працягу апошніх паўтара дзясятка гадоў пацвердзіла сваю эфектыўнасць – так аформіўся сінтэтычны курс «Літаратура і мастацтва». Гэты досвед у значнай ступені быў запазычаны з досведу суседніх краін: так, першаўзорам для аўтараў гэтай Праграмы служылі адпаведныя праграмныя асновы некалькіх пакаленняў, прынятыя міністэрствам адукацыі Рэспублікі Польшча.

Вывучэнне курса літаратуры і мастацтва ў ліцэі суправаджаецца засваеннем асобнага курса *беларускага фальклору*, які дапаўняе і развівае адпаведныя ўменні і навыкі навучэнцаў. Адпаведная праграма і дапаможнік распрацаваныя кандыдатам філалагічных навук, дацэнтам Алесем Лозкам.

# МЕТАДЫЧНАЯ НАТАТКА

Дысцыпліна «Літаратура і мастацтва» ў гуманітарным ліцэі арыентаваная на стварэнне для навучэнцаў магчымасцяў развіцця ўменняў і навыкаў, набытых імі на папярэднім этапе навучання. Курс літаратуры і мастацтва ў ліцэі скіраваны на спасціжэнне рэчаіснасці праз літаратурна-мастацкія вобразы, пашырэнне творчых здольнасцяў падлеткаў. Гістарычна-храналагічны прынцып падачы зместу літаратурна-мастацкай адукацыі павінен развіваць у навучэнцаў часава-прасторавае разуменне літаратурных і мастацкіх з'яў, спасціжэнне ўзаемасувязяў і ўзаемаўплываў у творчасці прадстаўнікоў розных пакаленняў стваральнікаў літаратуры і мастацтва.

Акрамя традыцыйных формаў урока або лекцыі павінны шырока практыкавацца семінары, наведванні мастацкіх выставаў, канцэртаў, імправізаваныя прэзентацыі новых кніг, абмеркаванне экранізацый паасобных класічных твораў, спектакляў, у т. л. створаных паводле твораў, што вывучаюцца. У суме метады навучання так ці іначай павінны спрыяць выяўленню самых розных функцый літаратуры і мастацтва: эстэтычнай, эўрыстычнай, выхаваўчай, камунікатыўнай. Агульным патрабаваннем для ўсіх метадаў навучання ёсць яго арыентацыя на эстэтычную сутнасць літаратуры і мастацтва. Пры гэтым творчае засвойванне адпаведнага курса павінна спрыяць як мага больш поўнай рэалізацыі задач эстэтычнага, грамадзянскага і патрыятычнага выхавання.

## Патрабаванні да ўменняў і навыкаў навучэнцаў на этапе II года навучання ў ліцэі

### I. Аналіз і інтэрпрэтацыя тэкстаў культуры

Навучэнец ужывае ў сваім аналізе найважнейшыя паняцці паэтыкі і тэорыі мастацтва; у інтэрпрэтацыі тэкстаў культуры выкарыстоўвае веды наконт кантэкстаў, у якіх дадзены тэкст можа быць успрыняты; даваць прапанову ўспрымання канкрэтнага тэксту культуры, абгрунтаваўшы яе; пры інтэрпрэтацыі тэксту культуры ўжывае неабходны біяграфічны або эстэтычна-мастацкі кантэкст; умее выразна дэкламаваць вывучаныя літаратурныя тэксты; здольны з разуменнем карыстацца паняццямі, што датычацца пазітыўных каштоўнасцяў і іх супрацьлегласцяў і даваць уласнае вызначэнне такім паняццям, як, напрыклад: прыгожае – непрыгожае, талерантнасць – неталерантнасць, патрыятызм – агрэсіўны нацыяналізм; умее даць характарыстыку ўніверсальных пазачасавых экзістэнцыяльных праблем, такіх як: каханне, сяброўства, смерць, пакуты, страх, рэлігійная вера. Надзея, іншасць, самотнасць, адчуванне супольнага існавання, справядлівасць, салідарнасць,; распазнае ў тэкстах культуры агульныя гуманістычныя каштоўнасці; адчувае адрознасць грамадзянскіх, звычаёвых, сямейных, культурных, рэлігійных традыцый і ў іх кантэксце фарміруе сваю самасвядомасць; разбіраецца ў неабходных для спасціжэння найважнейшых фактах з гісторыі літаратуры і мастацтваў; распазнае праблематыку канкрэтнага твора; умее вылучыць розныя сюжэтныя лініі або стылістычныя плыні твора; здольны апісваць пачуцці, якія выклікае ў яго адпаведны тэкст культуры; здольны ў агульным плане рабіць параўнаўчы аналіз твораў у кантэксце адпаведных літаратурных эпох.

## II. Параўнанне і супастаўленне тэкстаў культуры

Навучэнец павінен: параўноўваць творы розных гатункаў (родаў) і жанраў у межах адной эпохі або стылю; супастаўляць увасабленне найважнейшых тэм літаратуры і мастацтва ў іх гістарычна-культурнай дынаміцы; аналізаваць праявы нацыянальнага характару і нацыянальных літаратурных або мастацкіх школаў у межах пэўнай эпохі; выяўляць дынаміку развіцця пэўнага жанру ад эпохі да эпохі; усведамляць і тлумачыць, у тым ліку ў пісьмовых працах, узаемасувязь тэарэтычнага і практычнага засваення асноў літаратурна-мастацкай творчасці.

## III. Успрыманне пісьмовых выказванняў і выкарыстанне іх зместу

*Навучэнец павінен*: успрымаць напісаныя і вусныя тэксты з поўным разуменнем: адчуваць розніцу паміж вербальнай інфармацыяй і той, якая заключаецца ў гуках і вобразах; знаходзіць, закладзены ў тэксце і цытаваць адпаведныя фрагменты ў ім; упарадкоўваць інфармацыю ў залежнасці ад яе функцыі ў адпаведным тэксце; адрозніваць інфармацыю пра факты ад меркаванняў пра іх; распазнаваць адрозненні паміж вымыслам і свядомым падманам; распазнаваць выказванні эмацыйнага і сугестыўнага характару; распазнаваць інтэнцыі (мэты) выказвання; бачыць у выказваннях прыкметы агрэсіі і маніпуляцыі; умець дакладна выкарыстоўваць інфармацыю з каментароў ці зносак; умець фармуляваць свае вусныя або пісьмовыя выказванні на літаратурныя і мастацкія тэмы.

## IV. Стварэнне выказванняў

Навучэнец стварае звязныя выказванні сярэдняй ступені складанасці; здольны карыстацца найважнейшымі стылістыч-

ымі прыёмамі і вобразнымі сродкамі; умее апісваць у выглядзе звязнага тэксту свае ўражанні ад наведвання спектакля, выставы, канцэрту, прагляду фільмаў і іншых відэаматэрыялаў, умее браць слова ў дыскусіях з равеснікамі; мае кампетэнцыю ў рэдагаванні пісьмовых тэкстаў адпаведнага ўзроўню; умее ствараць план уласнага выказвання; умее карыстацца пэўнымі прынцыпамі логікі і рыторыкі; мае паняцце пра моўныя нормы і адхіленні ад іх; ужывае найбольш распаўсюджаныя фразеалагізмы; выкарыстоўвае розныя віды сказаў для стварэння пісьмовага выказвання; мае развіты лексічны запас і выкарыстоўвае яго ў сваіх выказваннях; трымаецца правілаў этыкі маўлення ў розных камунікацыйных сітуацыях; умее ацэньваць уласную моўную кампетэнтнасць; свядома і кампетэнтна выкарыстоўвае электронныя крыніцы інфармацыі.

## Асаблівасці літаратурна-мастацкай адукацыі II года навучання ў ліцэі

На II курсе ліцэя навучэнец набліжаецца да стадыі дарослага жыцця: гэта час эмацыйнага і інтэлектуальнага даспявання яго асобы, умення крытычна зірнуць на навакольную рэчаіснасць. Самастойныя рашэнні і дзеянні робяцца галоўнай рысай жыццёвай пазіцыі падлетка, якую ён гатовы бараніць як незалежнасць сваёй асобы. У гэты час навучэнец, як правіла, робіцца свядомым спажыўцом культуры, набывае пэўныя здольнасці сінтэзавання і сістэматызавання з’яў, звязаных з моўна-культурнымі традыцыямі свайго народа і навакольнай рэчаіснасцю. Чытанне літаратурных тэкстаў, успрыманне твораў розных відаў мастацтва дазваляе яму фармуляваць некаторыя жыццёва важныя пытанні і шукаць адказы на іх.

У гэтай сітуацыі роля выкладчыка палягае на разумным і далікатным кіраванні, стымуляванні самастойнага развіцця

асобы навучэнца, матываванні яго да ўдумлівага падыходу ва ўспрыманні твораў літаратуры і мастацтва. Варта асабліва адзначыць, што на гэтым этапе свайго жыцця навучэнцы робяцца ўражлівымі да пытання сваёй суб'ектнасці. Пры так або іначай выяўленым крытычным стаўленні да навакольнага свету ў асобе падлетка адначасова развіваюцца рысы талерантнасці да «іншасці». Задачай педагога ў такой сітуацыі ёсць стымуляванне такіх працэсаў, цярплівае і ненавязлівае прышчапленне навучэнцам умення паважаць іншыя думкі і іншы светапогляд.

У параўнанні з папярэднімі этапамі вывучэння літаратуры – як розных курсаў у першых сямі класах агульнаадукацыйнай школы, так і сінтэтычнага літаратурнага курса ў першы год навучання ў гуманітарным ліцэі – курс літаратуры і мастацтва II года ліцэя арыентаваны на паглыбленне пройдзенага матэрыялу ў вывучэнні літаратуры і мастацтва ад старажытнасці да пачатку XIX стагоддзя; пры гэтым вучні часткова вяртаюцца да вывучаных ужо аўтараў, але на прыкладзе тых твораў, з якімі раней яны не знаёміліся. Чытанне і аналіз дадатковых твораў аўтараў, збольшага сучасных беларускіх, з рубрык «Творы да кантэксту эпохі» павінны дапамагчы навучэнцу «ўжыцца» ў адпаведную эпоху, паглядзець на яе вачыма майстроў слова іншых пакаленняў.

Выкладчык увесь час мае дбаць пра тое, што раней набытыя веды, уменні і навыкі павінны знаходзіць не столькі колькаснае, колькі якаснае развіццё. Гэты вельмі істотны элемент судачыненняў паміж рознымі этапамі навучання павінен адыгрываць найважнейшую ролю ў кантэксце абмеркавання на занятках па літаратуры і мастацтве канкрэтных твораў, напісання разнастайных творчых прац кшталту сачынення або міні-эсэ. Выкладчык таксама павінен умець улічваць пэўную розніцу адукацыйных, эстэтычных, сацыяльных патрэбаў канкрэтных навучэнцаў.

Вывучэнне літаратуры і мастацтва на другім курсе ліцэя мае на мэце ў т. л. фарміраванне ў навучэнцаў гістарычна-мастацкай свядомасці. Навучэнец павінен беспамылкова ўмець вызначаць прыналежнасць фрагментаў класічных твораў да адпаведных эпох і плыняў, у т. л. праз асаблівасці іх мастацкага і моўнага ўвасаблення. Найлепшыя навучэнцы павінны вучыцца ў агульным плане распазнаваць *знакі традыцыі* – напрыклад, антычнай, усходняй, сярэднявечна-хрысціянскай, рэнесансавай і г. д. Гэта зусім не значыць, што навучэнцы павінны засвоіць менавіта курсы гісторыі літаратуры і гісторыі мастацтваў у храналагічным парадку. Найважнейшай задачай ёсць фармаванне ў іх навыку распазнавання асаблівасцяў *вобразнага мыслення* людзей розных эпох і цывілізацыйных колаў. Іншым, магчыма яшчэ больш важным, кампанентам літаратурна-мастацкай адукацыі ў ліцэі можа быць развіццё ў маладых людзей навыкаў мыслення ў аспекце праблемнага падыходу. Выкладчык павінен стымуляваць выказванне навучэнцамі альтэрнатыўных – у параўнанні са сфармуляванымі ў навучальных дапаможніках – думак. Адзінай умовай пры гэтым павінна быць імкненне знаходжання як мага больш пераканаўчых аргументаў на карысць сваёй думкі.

Галоўнай мэтай літаратурна-мастацкай адукацыі на адпаведным этапе навучання ў ліцэі павінна быць фармаванне ў маладых людзей навыкаў і ўменняў свядомага ўспрымання пісьмовых і вобразных выказванняў самых розных жанраў. Навучэнец павінен стаць свядомым карыстальнікам беларускай літаратурнай мовы, які ўмее распазнаваць эстэтычную каштоўнасць твораў літаратуры і мастацтва розных жанраў і самастойна ствараць пісьмовыя выказванні розных памераў, ужываючы патрэбныя дзеля гэтай мэты моўныя сродкі. Пры гэтым неабходна трымацца прынцыпу раўнапраўнасці непадзельнасці лінгвістычных і тэарэтычна-мастацкіх сродкаў,

не аддаючы выразнай перавагі адной з гэтых груп і разумеючы, што для адэкватнага і поўнага ўспрымання канкрэтных тэкстаў патрэбны пэўны ўзровень моўна-камунікатыўнай кампетэнтнасці.

Аналіз і інтэрпрэтацыя тэкстаў культуры належыць да базавых навыкаў, неабходных у жыцці кожнаму чалавеку. Вучні пачынаюць аналізаваць літаратурныя і мастацкія факты яшчэ ў пачатковай школе і з дапамогай іх супастаўлення і параўнання падступаюцца да інтэрпрэтацыйных дзеянняў. Навучэнцы II курса ліцэя павінны ў значным аб'ёме авалодаць аналітычным мысленнем праз рэалізацыю наступнай схемы:

успрыманнеÞаналізÞінтэрпрэтацыяÞстварэнне ўласнага тэксту / твора.

Менавіта аналіз і інтэрпрэтацыя ствараюць аснову, на якой грунтуецца засваенне праграмы па літаратуры і мастацтве ў ліцэі. Маецца на ўвазе, што гуманістычная, адукацыя на папярэднім этапе атрымання базавай літаратурна-мастацкай адукацыі ўжо наблізіла навучэнцаў да пачуццёвага ці рацыянальнага ўспрымання такіх паняццяў, як: пакуты, радасць існавання, каханне, спачуванне ахвярам, патрыятызм і г. д. У кожным выпадку, яны выразна сабе ўсвядомілі, што форма літаратурнага выказвання і яе значэнне знаходзяцца ў непарыўнай сувязі са зместам, ідэяй, праблематыкай таго ці іншага твора.

Навучанне на старэйшых курсах ліцэя павінна быць скіраваным на ўпарадкаванне наяўных ведаў, уменняў і навыкаў, усведамленне ўзаемадачыненняў паміж рознымі з'явамі і паняццямі літаратуры, філасофіі і мастацтва, спасціжэнне сутнасці працэсаў, што адбываюцца ў сферы культуры. Пры гэтым вельмі важна, каб навучэнцы выразна бачылі і асэнсоўвалі ўзаемазалежнасць, узаемапранікальнасць гэтых працэсаў, іх дыферэнцыяваны характар і магчымасць фармулявання аналогій.

Навучэнцы ў працэсе ўспрымання, аналізу і інтэрпрэтацыі канкрэтных тэкстаў культуры засвойваюць найважнейшыя паняцці: жанры, сюжэт, кампазіцыя, стыль, вобразна-выяўленчыя сродкі, тыпы герояў-персанажаў, літаратурна-мастацкі напрамак і інш.

Выкладчык не павінен успрымаць прапанаваны спіс літаратурных тэкстаў, прызначаных для вывучэння ў поўным аб'ёме ці ў фрагментах, як догму. Ён можа замяняць тэксты, што не ўваходзяць у абавязковую школьную праграму па сваёй ініцыятыве – галоўнае, каб у навучэнцаў пастаянна развівалася ўменне бачыць традыцыю ў сучаснасці, рабіць моўны і літаратуразнаўчы аналіз любога фрагмента з кожнага прапанаванага для знаёмства тэксту.

Радыкальныя змены ў інфармацыйна-камунікацыйнай прасторы, якія адбываюцца ва ўсім свеце ў апошнія дзесяцігоддзі, адным са сваіх адмоўных вынікаў маюць істотнае зніжэнне інтарэсу моладзі да чытання тэкстаў, што патрабуюць напружанай мыслядзейнасці і асаблівага эмацыйнага настрою дзеля іх адэкватнага ўспрымання. Таму надзвычай важным уяўляецца надаванне асаблівай увагі вырашэнню задачы фармавання ў ліцэістаў *чытацкіх навыкаў і ўменняў*, а ў першую чаргу наступных:

– уменняў і навыкаў, звязаных з эстэтычным успрыманнем літаратурнага, мастацкага твора або яго фрагмента (уяўленне малюнкаў і вобразаў, прапанаваных творцам; здольнасць эмацыйна адгукацца на «заклік» аўтара; выказванне першаснага, імпрэсіяністычнага ўражання і да т. п.);

– аналітычных уменняў і навыкаў (аналіз і інтэрпрэтацыя сюжэту, эпізоду, кампазіцыі, мовы твора або перакладу);

– сінтэзавальных уменняў і навыкаў (здольнасць супастаўляць, абагульняць, рабіць высновы);

– уменняў і навыкаў, звязаных з асабістай ацэнкай мастацкага твора (уменне зразумець і адчуць яго пафас, аўтарскае

разуменне жыцця і чалавечай асобы, здольнасць ацэньваць глыбіню праблематыкі, арыгінальнасць вобразаў, адметнасць стылю і г. д.).

## ЛІТАРАТУРА ДА ЎСІХ ТЭМ


1. Адамовіч Г. Я. З крыніц сусветнай літаратуры: Дапам. для наст. Мн.: БелЭн, 1998.
2. Адамовіч Г. Я. Літаратурная класіка: Дапаможнік. Мн.: БДПУ, 2009.
3. Астраух А. Э. Беларуская літаратура ў кантэксце сусветнай: Дапаможнік. Гродна: ГрДУ, 2001.
4. Баршчэўскі Л. Літаратура ад старажытнасці да пачатку эпохі рамантызму. Мн.: Сэр-Віт, 2003.
5. Беларуская школа: Тэзісы навукова-практ. канф. (28–29 сакавіка 1992 г.) / Рэдкал.: Л. Баршчэўскі (гал. рэд.) і інш. Мн.: БГАКЦ, 1992.
6. Дубянецкі Э. С. Культуралогія: Энцыкл. даведнік. Мн.: БелЭн, 2003.
7. Дубянецкі Э. С. Сусветная культура: Ад старажытнасці да нашых дзён. Мн.: БелЭн, 2001.
8. Захарына Ю. Ю., Зелянеўская С. М. Сусветная мастацкая культура. Ч. 1. Ад вытокаў да Сярэднявечча. Ч. 2. Ад Адраджэння да пач. XXI ст. Мн.: БДПУ, 2011.
9. І боль, і прыгажосць… Выбр. тв. паэтаў Еўропы і Амерыкі ў перакладах Лявона Баршчэўскага. Мн.: Зміцер Колас, 2016.
10. Каляда А. А. Слоўнік акцёра і рэжысёра. Мн.: Асар, 1995.
11. Коллинз С. Классическая музыка от и до. Пространство, наполненное гармонией / Пер. с англ. Москва: ФАИР-ПРЕСС, 2000.
12. Лазука Б. А. Слоўнік тэрмінаў: Архітэктура, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Дапам. для вучняў. Мн.: Беларусь, 2001.
13. Лазука Б. А. Гісторыя сусветнага мастацтва. Ад старажытных часоў па XVI стагоддзе [Т. I]. XVII–XVIII ст. [Т. II]. Мн.: Беларусь, 2010.

14. Мастацтва. Вучэб. дапам.-хрэстаматыя для 9 кл. / Аўт.-укл. Т. Я. Вазінская. Мн.: Лімарыус, 1997.
15. Методыка выкладання айчыннай і сусветнай мастацкай культуры: вуч.-метад комплекс па вучэбн. дысцыпл. / Склад. Ю Ю. Захарына, М. А. Бабчанок. Мн.: БДПУ, 1914.
16. Методыка выкладання беларускай літаратуры: вуч. праграма для выш. навуч. уст. / Склад. В. Ю. Дылеўская і інш. Мн.: БДУ, 2005.
17. Музычны слоўнік беларуска-рускі. Музыкальный словарь русско-белорусский / Аўт.-склад.: Г. Р. Куляшова, Т. Г. Мдывані і інш. Мн.: Бел. навука, 1999.
18. Навучальныя праграмы для гуманітарнага ліцэя / Скл. Баршчэўскі Л. П., Васючэнка П. В., Дадзіёмава В. У. і інш. Мн.: [БГАКЦ], 1992.
19. Рагойша В. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах. Мн.: БелЭн, 2001.
20. Рагойша В. П., Кабржыцкая Т. В. і інш. Беларуская літаратура: Вучэбн. дапам. для 10 кл. агульнаадукац. шк. з профільн. і паглыбл. вывучэннем бел. літ., ліцэяў, гімназій. Мн.: Нар. асвета, 2001.
21. Родная літаратура: Хрэстаматыя для 10 кл. сярэдняй школы / Скл. М. А. Лазарук, Л. К. Цітова, В. У. Івашын. Мн.: Маст. літ., 1997.
22. Снапкоўская С. В., Вараб'ёва В. А. і інш. Асновы культуралогіі: Канспект лекцый. Мн.: Асар, 2008.
23. Тысячи лет музыки: Пособие для учителя ОМХК / 8 кл. Фонохрестоматия (на 3-х CD) / Авт.-сост. В. Д. Юркевич. Мн.: Новое знание, 2007.
24. Хрэстаматыя па літаратуры народаў свету: Кн. у дапамогу тым, хто вывучае сусветную літаратуру. 9 кл. Ч. 1. Мн.: БГАКЦ, 1995.
25. Шаблоўская І. Сусветная літаратура ў беларускай прасторы: Рэцэпцыя, тыпалогія, кантакты. Мн.: Радыёла-плюс, 2007.
26. Яцухна В. І. Тэорыя літаратуры: Дапаможнік. Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2006.
27. Culler, J. Literary Theory. A Very Short Introduction. Oxford University Press 1997.

28. Edukacja artystyczna i kulturalna. Podstawa programowa z komentarzami. T. 7 [Ministerstwo Edukacji Narodowej RP, 2010].
29. Język polski. Podstawa programowa z komentarzami. T. 2 [Ministerstwo Edukacji Narodowej RP, 2010].

# ЗМЕСТ ВЫВУЧЭННЯ КУРСА

## ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА Ў ЖЫЦЦІ ЛЮДЗЕЙ

Паняцці «культура», «духоўная культура», «мастацтва», «літаратура» і іх узаемадзеянне. Мастацкі вобраз. Праблема сімвала ў мастацтве. Уяўленне пра мастацкую рэальнасць. Віды мастацтва. Пазнавальны аспект мастацтва. Аўтарскі пачатак у мастацтве. Мастацтва і іншыя формы грамадскай свядомасці.

### Літаратура да тэмы

1. Дубянецкі Э. С. Культуралогія: Энцыкл. даведнік. Мн.: БелЭн, 2003. С. 215–216.
2. Захарына Ю. Ю., Зелянеўская С. М. Сусветная мастацкая культура. Ч. 1. Ад вытокаў да Сярэднявечча. Мн.: БДПУ, 2011. С. 7–15.
3. Рагойша В. П., Кабржыцкая Т. В. і інш. Беларуская літаратура: Вучэбн. дапам. для 10 класа агульнаадукац. шк. з профільн. і паглыбл. вывучэннем бел. літ., ліцэяў, гімназій. Мн.: Нар. асвета, 2001. С. 506–510.
4. Яцухна В. І. Тэорыя літаратуры: Дапаможнік. Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2006. С. 46–65.

## МАСТАЦТВА ПЕРШАБЫТНАГА СВЕТУ

Асаблівасці мастацтва эпох палеаліту, мезаліту, бронзавага і жалезнага веку. Сінкрэтызм першабытнага мастацтва.

### Творы мастацтва

Выява бізонаў з пячоры Альтаміра (Іспанія)
«Вілендорфская Венера» (Аўстрыя)
Стоўнхендж (Англія)
Скіфскія лучнікі (са скіфскіх курганоў)

### Літаратура да тэмы


1. Дубянецкі Э. С. Сусветная культура: Ад старажытнасці да нашых дзён. Мн.: БелЭн, 2001. С. 5–12.
2. Захарына Ю. Ю., Зелянеўская С. М. Сусветная мастацкая культура. Ч. 1. Ад вытокаў да Сярэднявечча. Мн.: БДПУ, 2011. С. 25–28.
3. Лазука Б. А. Гісторыя сусветнага мастацтва. Ад старажытных часоў па стагоддзе. Мн.: Беларусь, 2010. С. 5–11.
4. Мастацтва. Вучэб. дапам.-хрэстаматыя для 9 кл. / Аўт.-укл. Т. Я. Вазінская. Мн.: Лімарыус, 1997. С. 4–6.
5. Снапкоўская С. В., Вараб’ёва В. А. і інш. Асновы культуралогіі: Канспект лекцый. Мн.: Асар, 2008. С. 28–29.


## ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА СТАРАЖЫТНАГА УСХОДУ

Мастацтва найстаражытнейшых цывілізацый: Міжрэчча, Егіпет, Індыя

Узнікненне літаратуры. Літаратура як від мастацтва. Літаратура і міфалогія.

Егіпецкія гімны
Шумера-акадскі «Эпас пра Гільгамеша»
Індыйскія Веды («Рыгведа»)

## Творы мастацтва

Белы храм ва Уруку
Брама багіні Іштар у Вавілоне
Піраміда Джосэра ў Егіпце
Скульптура-бюст Неферціці
«Егіпецкія музыканты» (малюнак)
Індыйскі горад Махенджа-Дара (забудова)
Вялікая Ступа ў Санчы (Індыя)

## Літаратурныя творы

Усхваленне Ніла (егіпецкі гімн)
Эпас пра Гільгамеша
Рыгведа (хвалебен 77)

## Творы да кантэксту эпохі

М. Чарняўскі. Вогнепаклоннікі
В. Іпатава. Залатая жрыца Ашвінаў

## Літаратура да тэмы


1. Баршчэўскі Л. Літаратура ад старажытнасці да пачатку эпохі рамантызму. Мн.: Сэр-Віт, 2003. С. 3–7.
2. Дубянецкі Э. С. Сусветная культура: Ад старажытнасці да нашых дзён. Мн.: БелЭн, 2001. С. 13–53.
3. Захарына Ю. Ю., Зелянеўская С. М. Сусветная мастацкая культура. Ч. 1. Ад вытокаў да Сярэднявечча. Мн.: БДПУ, 2011. С. 33–48.
4. Зуёнак В. «Я адкрыю табе запаветнае слова…» [Пра «Эпас пра Гільгамеша»] // Роднае слова. 1998. № 8. С.26–31.
5. Лазука Б. А. Гісторыя сусветнага мастацтва. Ад старажытных часоў па XVI стагоддзе. Мн.: Беларусь, 2010. С. 12–34.
6. Мастацтва. Вучэб. дапам.-хрэстаматыя для 9 кл. / Аўт.-укл. Т. Я. Вазінская. Мн.: Лімарыус, 1997. С. 6–7.

7. Рагойша В. П., Кабржыцкая Т. В. і інш. Беларуская літаратура: Вучэбн. дапам. для 10 кл. агульнаадукац. шк. з профільн. і паглыбл. вывучэннем бел. літ., ліцэяў, гімназій. Мн.: Нар. асвета, 2001. С. 46–63.
8. Снапкоўская С. В., Вараб'ёва В. А. і інш. Асновы культуралогіі: Канспект лекцый. Мн.: Асар, 2008. С. 30–33.
9. Яцухна В. І. Тэорыя літаратуры: Дапаможнік. Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2006. С. 67–80.

## АНТЫЧНАЕ МАСТАЦТВА І ЛІТАРАТУРА

Крыта-мікенская культура: яе паходжанне і асаблівасці.

Міфалогія Старажытнай Грэцыі і Рыма.

Старагрэцкае мастацтва. «Сем цудаў свету» Найважнейшыя помнікі грэцкай архітэктуры і скульптуры архаічнага і класічнага перыядаў. Паняцце ордару. Развіццё грэцкага тэатра. Асаблівасці эліністычнай культуры. Грэцкі вазапіс. Музыка Старажытнай Грэцыі.

Узнікненне і развіццё літаратуры на грэцкай мове.

Старагрэцкі эпас

Гамер

Старагрэцкая лірыка

Сапфо

Старагрэцкая драма і тэатр

Эсхіл

Сафокл

Эўрыпід

Арыстафан

Старагрэцкая літаратура і філасофія

Арыстотэль і яго «Паэтыка»

Старагрэцкая проза

Эсхіл

Літаратура і мастацтва Старажытнага Рыма

Катул

Вергілій

Гарацый

Іншыя жанры рымскай літаратуры.

## Творы мастацтва

Кноскі палац на Крыце і яго роспісы
Пахавальня Атрэя каля Мікенаў
Львіная брама ў Мікенах
Творы дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва мікенскіх майстроў
Святыня (храм) Геры ў Алімпіі
Парфенон на Акропалі ў Афінах
Тэатр у Эпідаўры
Тэатр Дыёніса ў Афінах
Міран. Дыскабол
Агесандр, Палідор, Атэнадор. Лаакаон
Скаліён Сэйкіля
Капіталійская ваўчыца
Рымскі Калізей
Конная статуя Марка Аўрэлія
Трыумфальная арка Ціта ў Рыме

## Літаратурныя творы

Гамер. Іліяда
Сапфо. Вершы
Сафокл. Антыгона
Эўрыпід. Медэя
Арыстафан. Жабы
Арыстотэль. Паэтыка
Лонг. Дафніс і Хлоя
Катул. Вершы
Вергілій. Энеіда
Гарацый. Памятнік [Да Мельпамены]

## Творы да кантэксту эпохі

М. Багдановіч. «Калі зваліў дужы Геракл…»
М. Танк. «З амфары гэтай даўно…»
А. Салавей. «Пачні з Гамера, ці пачні з Сакрата…»
В. Аксак. Сапфо
І. Багдановіч. Прыватныя рымляне
Р. Барадулін. Цень Катула

## Літаратура да тэмы


1. Адамовіч Г. Я. Літаратурная класіка: Дапаможнік. Мн.: БДПУ, 2009. С. 17–25, 55–66.
2. Антычная літаратура ў беларускіх перакладах. Старажытная Грэцыя: Хрэст. / Уклад. Д. М. Лебядзевіч. Гродна: ГрДУ, 2002.
3. Антычная літаратура ў беларускіх перакладах. Старажытны Рым: Хрэст. / Уклад. Д. М. Лебядзевіч. Гродна: ГрДУ, 2003.
4. Баршчэўскі Л. Літаратура ад старажытнасці да пачатку эпохі рамантызму. Мн.: Сэр-Віт, 2003. С. 12–54.
5. Вэйн П. Ці верылі грэкі ў свае міфы? / Пер. з франц. Зм. Коласа. Мн.:Энцыклапедыкс, 2000.
6. Дубянецкі Э. С. Сусветная культура: Ад старажытнасці да нашых дзён. Мн.: БелЭн, 2001. С. 76–116.
7. Захарына Ю. Ю., Зелянеўская С. М. Сусветная мастацкая культура. Ч. 1. Ад вытокаў да Сярэднявечча. Мн.: БДПУ, 2011. С. 85–104.
8. Катул, Гай Валерый. Выбраныя вершы / Пер. А. Ф. Брыля. Мн.: Зм. Колас, 2017.
9. Лазука Б. А. Гісторыя сусветнага мастацтва. Ад старажытных часоў па XVI стагоддзе. Мн.: Беларусь, 2010. С. 34–81.
10. Легенды і міфы Старажытнай Грэцыі / Пераказ У. Анісковіча. Мн.: Юнацтва, 1996.
11. Малюковіч С. Д. Міфалогія: Старажытная Элада. Ч. 1. Мн.:БДУ, 2000.
12. Мастацтва. Вучэб. дапам.-хрэстаматыя для 9 кл. / Аўт.-укл.

Т. Я. Вазінская. Мн.: Лімарыус, 1997. С. 30–36, 80–83, 86–89, 108–111.

13. Рагойша В. П., Кабржыцкая Т. В. і інш. Беларуская літаратура: Вучэбн. дапам. для 10 кл. агульнаадукац. шк. з профільн. і паглыбл. вывучэннем бел. літ., ліцэяў, гімназій. Мн.: Нар. асвета, 2001. С. 69–117.
14. Сапфо. Песні / Пер. Л. Баршчэўскага. Мн.: Зм. Колас, 2016.
15. Тысячи лет музыки: Пособие для учителя ОМХК / 8 кл. (+Фонохрестоматия) / Авт.-сост. В. Д. Юркевич. Мн.: Новое знание, 2007. С. 4–8 (+Запіс: CD 1, № 2).
16. Хрэстаматыя па літаратуры народаў свету: Кн. у дапамогу тым, хто вывучае сусветную літаратуру. 9 кл. Ч. 1. Мн.: БГАКЦ, 1995. С. 6–127.
17. Эсхіл. Прыкуты Праметэй; Сафокл. Антыгона / Пер. Л. Баршчэўскага, Ю. Дрэйзіна. Мн.: БГАКЦ, 1993.

## БІБЛІЯ ЯК ПОМНІК СТАРАЖЫТНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Узнікненне монатэістычнай рэлігіі ў старажытных іўдзеяў. Кнігі Старога Запавету. Асаблівасці Новага Запавету. Сэнс і сімволіка біблійных кніг. Роля Бібліі ў станаўленні еўрапейскай цывілізацыі.

### Творы мастацтва

Другі Храм (храм Ірада Вялікага) у Ерусаліме

### Літаратурныя творы

Кніга Быцця
Найвышэйшая Песня Саламонава
Казань на Гары (з Евангелля ад Мацвея)

## Творы да кантэксту эпохі

Х. Мемлінг. Страшны Суд
Р. Барадулін. Перад выхадам з Егіпту
І. Багдановіч. Вавілон
У. Папковіч. Цар Навухаданосар і тры іўдзеі
С. Законнікаў. Туман

## Літаратура да тэмы


1. Адамовіч Г. Я. Літаратурная класіка: Дапаможнік. Мн.: БДПУ, 2009. С. 25–31.
2. Астраух А. Э. Беларуская літаратура ў кантэксце сусветнай: Дапаможнік. Гродна: ГрДУ, 2001. С. 38–43.
3. Баршчэўскі Л. Літаратура ад старажытнасці да пачатку эпохі рамантызму. Мн.: Сэр-Віт, 2003. С. 56–66.
4. Біблія: Кнігі Сьвятога Пісаньня Старога і Новага запавету / Пер. В. Сёмухі. World Wide Printing, Duncanville, USA, 2002.
5. Дубянецкі Э. С. Культуралогія: Энцыкл. даведнік. Мн.: БелЭн, 2003. С. 141–142.
6. Новы Запавет Госпада нашага Ісуса Хрыста / Пер. А. Клышкі. Мн.: Пазітыў-цэнтр, 2014.
7. Рагойша В. П., Кабржыцкая Т. В. і інш. Беларуская літаратура: Вучэбн. дапам. для 10 кл. агульнаадукац. шк. з профільн. і паглыбл. вывучэннем бел. літ., ліцэяў, гімназій. Мн.: Нар. асвета, 2001. С. 118–142.
8. Сініла Г. В. Біблія як феномен культуры і літаратуры. Ч. 1: Духоўны і мастацкі свет Торы. Кнігі Быцця. Мн.: Бел. навука, 2003. С. 3–22, 65–87.
9. Сініла Г. В. Біблія як феномен культуры і літаратуры. Ч. 2: Духоўны і мастацкі свет Торы. Кніга Зыходу. Мн.: Бел. навука, 2004. С. 307–348.

# З ЛІТАРАТУРЫ СЯРЭДНЯВЕЧНАГА УСХОДУ

Сярэднявечча – эпоха ў развіцці чалавецтва
У коле ісламу
Творчасць Умара Хаяма

## Творы мастацтва

Мячэць Алі ў Ісфахане

## Літаратурныя творы

Умар Хаям. Рубаі

## Творы да кантэксту эпохі

Р. Крушына. Рубаі
А. Мінкін. Паводле Амара Хаяма

## Літаратура да тэмы


1. Баршчэўскі Л. Літаратура ад старажытнасці да пачатку эпохі рамантызму. Мн.: Сэр-Віт, 2003. С. 75–78, 344.
2. Дубянецкі Э. С. Культуралогія: Энцыкл. даведнік. Мн.: БелЭн, 2003. С. 139–140.
3. Захарына Ю. Ю., Зелянеўская С. М. Сусветная мастацкая культура. Ч. 1. Ад вытокаў да Сярэднявечча. Мн.: БДПУ, 2011. С. 166–169.
4. Рагойша В. П., Кабржыцкая Т. В. і інш. Беларуская літаратура: Вучэбн. дапам. для 10 кл. агульнаадукац. шк. з профільн. і паглыбл. вывучэннем бел. літ., ліцэяў, гімназій. Мн.: Нар. асвета, 2001. С. 186–192.
5. Умар Хаям. Выбраныя рубаі / Пер. Р. Барадуліна. Мн.: Зм. Колас, 2016.
6. Хрэстаматыя па літаратуры народаў свету: Кн. у дапамогу тым, хто вывучае сусветную літаратуру. 9 кл. Ч. 1. Мн.: БГАКЦ, 1995. С. 156–157.

# ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА СЯРЭДНЯВЕЧЧА Ў ЕЎРОПЕ

Рэлігійнае (хрысціянскае) мастацтва. Візантыйскі, раманскі і гатычны стылі ў архітэктуры і выяўленчым мастацтве і іх асаблівасці. Сакральная архітэктура, іканапіс, скульптура, фрэскі, мазаікі, вітражы.

Рэлігійная музыка ў каталікоў і праваслаўных. Візантыйскія кандакі і гімны. Грыгарыянскія харалы. Узнікненне месы і матэта. Царква і тэатр. Містэрыі, міраклі, маралітэ.

Царкоўна-рэлігійная літаратура Сярэднявечча і яе найважнейшыя жанры.

Візантыйская традыцыя ў літаратуры і мастацтве.

Візантыйскія жыцціі, малітвы, каноны.

«Жыціе Ефрасінні Полацкай».

Паэтычнае красамоўства Кірылы Тураўскага.

Свецкая літаратура і мастацтва. Роля фальклору ў станаўленні беларускай і іншых літаратур.

Сярэднявечны еўрапейскі эпас.

Самыя старажытныя еўрапейскія эпасы. «Бэўвульф».

Старафранцузскі гераічны эпас. «Песня пра Раланда».

Усходнеславянскі гераічны эпас «Слова пра паход Ігаравы».

Летапісы (кронікі) як жанр сярэднявечнай эпічнай прозы

Рыцарская (куртуазная) культура. Народна-смехавая (карнавальная) культура. Гістрыёны. Асаблівасці гарадской культуры.

Сярэднявечная еўрапейская паэзія.

Творчасць трубадураў, трувэраў, мінезінгераў.

Еўрапейскі рыцарскі раман.

«Парсіваль».

«Аповесць аб Трышчане».

## Творы мастацтва

Храм св. Дзімітрыя ў Салоніках
Ісідар з Мілета, Анфімій з Тралаў. Сафійскі сабор у Канстанцінопалі
Юстыніян са сваім атачэннем (фрэска сабора Сан-Вітале ў Равене)
Раман Міласпеўны. Кандак
Маці Божая Уладзімірская (абраз)
Сафійскі сабор у Кіеве
Сафійскі сабор у Ноўгарадзе
Сафійскі сабор у Полацку (рэканструкцыя)
Царква Спаса і Еўфрасінні ў Полацку і фрэскі ў ёй.
Л. Богша. Крыж св. Еўфрасінні Полацкай
Каложская царква св. Барыса і Глеба ў Гродне
Спаса-Праабражэнскі сабор у Чарнігаве
Царква Пакрова-на-Нерлі
А. Рублёў. Тройца Старазапаветная
Саборны ансамбль у Пізе
Замак Кведлінбург
Камянецкая вежа
Сабор Нотр-Дам у Парыжы
Сабор св. Віта ў Празе
Домскі сабор у Рызе
Сабор св. Ганны ў Вільні
Вітражы сабора ў Шартры
Грыгарыянскія харалы
Арганумы Леаніна і Перацына
Г. Машо. Меса
Гіраўт дэ Барнэль. Песня «Non posc sofrir c’a la dolor…»

## Літаратурныя творы

Паладый Еленапольскі. Пра Нафанаіла (з «Лаўсаніка»)
Іаан Залатавусны. Малітва

Жыціе Еўфрасінні Полацкай
Кірыла Тураўскі. Слова на Антыпасху
Аповесць мінулых гадоў
Старонкі Полацкага летапісу
Пахвала вялікаму князю Вітаўту
Бэўвульф
Багародзіца
Песня пра Раланда
Слова пра паход Ігаравы
Бертран дэ Борн. Плач
Парсіваль
Аповесць пра Трышчана

## Творы да кантэксту эпохі

Масей Сяднёў. Анёл
У. Караткевіч. Каложа. Дзіва на Нерлі
Алесь Звонак. Цень Ефрасінні
Данута Бічэль. Ефрасіння Полацкая
Ларыса Раманава. Маці Божая Уладзімірская
М. Багдановіч. Сабор святой Анны ў Вільні
Р. Крушына. Notre-Dame. Кансона
І. Багдановіч. Кірмаш трубадураў

## Літаратура да тэмы


1. Адамовіч Г. Я. З крыніц сусветнай літаратуры: Дапам. для наст. Мн.: БелЭн, 1998. С. 79–147.
2. Анталогія беларускай паэзіі. Т. 1 / Укл. А. Мальдзіс і інш. Мн.: Маст. літ., 1993. С. 20–41.
3. Баршчэўскі Л. Літаратура ад старажытнасці да пачатку эпохі рамантызму. Мн.: Сэр-Віт, 2003. С. 83–118.
4. Беларускі Трышчан / Падр. А. Бразгунова і Н. Старавойтавай, прадм. М. Машкевіча. Уроцлаў: KEW im. J. Nowaka-Jeziorańskiego, 2006.

5. Беларускія летапісы і хронікі / Укл. У. Арлова, прадм. В. Чамярыцкага. Мн.: Бел. кнігазбор, 1997. С. 5–68.
6. Беларусы. Т. 11: Музыка / Т. Б. Варфаламеева і інш.. Мн.: Бел. навука, 2008. С. 338–340.
7. Бэўвульф / Пер. са стараанг. А. Ф. Брыля. Мн.: Зм. Колас, 2013.
8. Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў. Т. 1 / Нав. рэд. тома В. А. Чамярыцкі. Мн.: Бел. навука, 2006. С. 15–258.
9. Даркевич В. П. Народная культура средневековья. М.: Наука, 1988.
10. Дубянецкі Э. Асветнікі Беларусі: Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Францыск Скарына. Мн.: БелЭн, 2016. С. 4–47.
11. Дубянецкі Э. С. Культуралогія: Энцыкл. даведнік. Мн.: БелЭн, 2003. С. 69–70, 84–86, 313–314.
12. Дубянецкі Э. С. Сусветная культура: Ад старажытнасці да нашых дзён. Мн.: БелЭн, 2001. С. 117–141.
13. Захарына Ю. Ю., Зелянеўская С. М. Сусветная мастацкая культура. Ч. 1. Ад вытокаў да Сярэднявечча. Ч. 2. Ад Адраджэння да пач. XXI ст. Мн.: БДПУ, 2011. С. 105–137.
14. І боль, і прыгажосць… Выбр. тв. паэтаў Еўропы і Амерыкі ў перакладах Лявона Баршчэўскага. Мн.: Зміцер Колас, 2016. С. 20–45.
15. Кніга жыцій і хаджэнняў. Мн.: Маст. літ., 1994. С. 3–163.
16. Лазука Б. А. Гісторыя беларускага мастацтва. Т. І: Першабытны лад – XVI стагоддзе. Мн.: Беларусь, 2007. С. 30–120.
17. Лазука Б. А. Гісторыя сусветнага мастацтва. Ад старажытных часоў па XVI стагоддзе. Мн.: Беларусь, 2010. С. 82–136, 223–247.
18. Літаратура XI–XVI стагоддзяў. Т. 1. / Нав. рэд. В. А. Чамярыцкі. Мн.: Маст. літ., 2012. С. 43–165.
19. Мастацтва. Вучэб. дапам.-хрэстаматыя для 9 кл. / Аўт.-укл. Т. Я. Вазінская. Мн.: Лімарыус, 1997. С. 114–157, 346–371.
20. Парсіваль / Пер. Л. Галяка. Прадм. З. Пазьняка. Нью-Ёрк – Вільня – Варшава, 2009.
21. Рагойша В. П., Кабржыцкая Т. В. і інш. Беларуская літаратура: Вучэбн. дапам. для 10 кл. агульнаадукац. шк. з профільн. і па-

глыбл. вывучэннем бел. літ., ліцэяў, гімназій. Мн.: Нар. асвета, 2001. С. 143–180.
22. Разанаў А. Кніга ўзнаўленняў. Мн.: Логвінаў, 2005. С. 5–17.
23. Родная літаратура: Хрэстаматыя для 10 кл. сярэдняй школы / Скл. М. А. Лазарук, Л. К. Цітова, В. У. Івашын. Мн.: Маст. літ., 1997. С. 51–86, 89–99.
24. Сасноўскі Зм. Гісторыя беларускай музычнай культуры: Ад старажытнасці да канца XVIII стагоддзя. Мн.: Харвест, 2010. С. 27–85.
25. Снапкоўская С. В., Вараб'ёва В. А. і інш. Асновы культуралогіі: Канспект лекцый. Мн.: Асар, 2008. С. 50–58.
26. Старажытная беларуская літаратура: Зборнік. / Прадм. У. Кароткага. Мн.: Юнацтва, 2002. С. 5–124.
27. Трусаў А. Кароткая гісторыя архітэктуры Беларусі. Мн.: Харвест, 2015. С. 33–84.
28. Трусаў А. Гісторыя сярэднявечнай Еўропы (V–XV стагоддзі). Мн.: Зм. Колас, 2017. С. 42–45, 138–139, 143–157, 195–200.
29. Тысячи лет музыки: Пособие для учителя ОМХК / 8 кл. Фонохрестоматия (на 3-х CD) / Авт.-сост. В. Д. Юркевич. Мн.: Новое знание, 2007. С. 9–16, 18–20 (+Запісы, CD 1, №№ 4, 6, 11, 13, 16, 18).
30. Харэўскі С. Гісторыя мастацтва і дойлідства Беларусі. Вільня: ЕГУ, 2007. С. 21–51.
31. Хрэстаматыя па літаратуры народаў свету: Кн. у дапамогу тым, хто вывучае сусветную літаратуру. 9 кл. Ч. 1. Мн.: БГАКЦ, 1995. С. 165–216.

## ПАЧАТАК ЭПОХІ РЭНЕСАНСУ

Паняцце Протарэнесансу. Новы этап развіцця гарадоў Італіі. Роля антычнай спадчыны. Фарміраванне рэнесансавага гуманізму. Асаблівасці твораў жывапісцаў (Джота, Дуча, С. Марціні), скульптараў (Н. Пізана). Ранняе Адраджэнне ў Італіі, Нідэрландах, Францыі. Творчасць італьянскіх мастакоў

(Мазачча, С. Батычэлі), скульптараў (Данатэла), архітэктараў (Ф. Брунэлескі, Л. Б. Альбэрці). Нідэрландскае ранняе Адраджэнне: творы жывапісцаў (браты ван Эйкі, Р. ван дэр Вейдэн, Х. Мемлінг) і кампазітараў (Ё. Окегем, Я. Обрэхт, Ж. Дэпрэ). Ранняе Адраджэнне ў Францыі: творчасць Ж. Фуке.

Асаблівасці літаратуры Протарэнесансу і ранняга Адраджэння. Жанр санета.

Дантэ Аліг’еры і яго «Боская камедыя»

Франчэска Петрарка і яго «Канцаньерэ»

Далейшае развіццё карнавальна-смехавой традыцыі ў французскіх творцаў (Ф. Віён, Ф. Рабле)

### Творы мастацтва

Джота. Нараджэнне Маці Боскай
С. Батычэлі. Нараджэнне Венеры
Данатэла. Давід
Ф. Брунэлескі. Купал сабора Санта-Марыя дэль Ф’ёрэ ў Фларэнцыі
Л. Б. Альбэрці. Палац Ручэлі ў Фларэнцыі
Ян ван Эйк. Партрэт пары Арнальфіні
Ё. Окегем. Меса «Mi-mi»
Ж. Фуке. Партрэт караля Карла VII

### Літаратурныя творы

Дантэ Аліг’еры. Боская камедыя
Ф. Петрарка. Санеты
Ф. Віён. Балада шыбенікаў
Ф. Рабле. Гарганцюа і Пантагруэль

### Творы да кантэксту эпохі

М. Танк. «Аднойчы я ішоў з Дантэ..»
У. Караткевіч. Апошняя песня Дантэ

## Літаратура да тэмы


1. Адамовіч Г. Я. З крыніц сусветнай літаратуры: Дапам. для наст. Мн.: БелЭн, 1998. С. 148–153.
2. Баршчэўскі Л. Літаратура ад старажытнасці да пачатку эпохі рамантызму. Мн.: Сэр-Віт, 2003. С. 119–130, 359–371.
3. Бэрк П. Народная культура Эўропы ранняга Новага часу / Пер. з англ. І. Ганэцкай. Мн.: Тэхналогія, 1999. С. 93–97.
4. Бэрк П. Рэнесанс / Пер. з англ. А. Арловай. Мн.: БГАКЦ, 1997. С. 5–14.
5. Дантэ Аліг'еры. Боская камедыя / Пер. Ул. Скарынкіна. Мн.: Маст. літ., 1997.
6. Дантэ Аліг'еры. Новае жыццё. Франчэска Петрарка. Кніга песень. Мн.: Маст. літ., 2011.
7. Захарына Ю. Ю., Зелянеўская С. М. Сусветная мастацкая культура. Ч. 2. Ад Адраджэння да пач. XXI ст. Мн.: БДПУ, 2011. С. 6–12.
8. І боль, і прыгажосць… Выбр. тв. паэтаў Еўропы і Амерыкі ў перакладах Лявона Баршчэўскага. Мн.: Зміцер Колас, 2016. С. 44–57.
9. Лазука Б. А. Гісторыя сусветнага мастацтва. Ад старажытных часоў па XVI стагоддзе. Мн.: Беларусь, 2010. С. 149–163, 188–197, 208–210.
10. Мастацтва. Вучэб. дапам.-хрэстаматыя для 9 кл. / Аўт.-укл. Т. Я. Вазінская. Мн.: Лімарыус, 1997. С. 163–164.
11. Петрарка Ф. Выбраныя песні з «Канцаньерэ» / Пер. Л. Баршчэўскага. Мн.: Зм. Колас, 2016.
12. Рагойша В. П., Кабржыцкая Т. В. і інш. Беларуская літаратура: Вучэбн. дапам. для 10 кл. агульнаадукац. шк. з профільн. і паглыбл. вывучэннем бел. літ., ліцэяў, гімназій. Мн.: Нар. асвета, 2001. С. 199–209.
13. Тысячи лет музыки: Пособие для учителя ОМХК / 8 кл. Фонохрестоматия (на 3-х CD) / Авт.-сост. В. Д. Юркевич. Мн.: Новое знание, 2007. С. 21–22 (+Запіс: CD 1, № 19)
14. Хрэстаматыя па літаратуры народаў свету: Кн. у дапамогу

тым, хто вывучае сусветную літаратуру. 9 кл. Ч. 1. Мн.: БГАКЦ, 1995. С. 217–238, 245–272.

## СТАЛАЕ ЕЎРАПЕЙСКАЕ АДРАДЖЭННЕ

Культура Адраджэння і яе разнавіднасці (уводзіны). Філасофія эпохі Адраджэння

Высокае Адраджэнне ў італьянскай архітэктуры (Д. Брамантэ, Мікельанджэла), жывапісе (Л. да Вінчы, Рафаэль, Джарджонэ, Мікельанджэла), скульптуры (Мікельанджэла), музыцы (Дж. Палестрына). Нідэрланды і Нямеччына: жывапісныя і графічныя творы Е. Босха, А. Дзюрэра, Л. Кранаха, Г. Гольбайна-мал. Мастацтва і літаратура сталага французскага Адраджэння. Жывапіс (Ф. Клюэ), скульптура (Ж. Гужон), архітэктура (П. Леско), музыка (К. Жанекен), літаратура (паэты «Плеяды»)

Позняе Адраджэнне ў Італіі (жывапіс Тыцыяна, Тынтарэта, музыка Джэзуальда), Нідэрландах (жывапіс П. Брэйгеля-ст., музыка А. Ласа)

Польскае Адраджэнне ў музыцы (М. Гамулка) літаратуры

Мікалай Рэй

Ян Каханоўскі

Адраджэнне ў мастацтве Вялікага Княства Літоўскага. Рэнесансавыя тэндэнцыі ў архітэктуры і жывапісе. Мастацтва кнігі. Асаблівасці музычнай культуры (беларускія канты, творы Ц. Базіліка, В. Длугарая)

Адраджэнне ў літаратуры ВКЛ. Лацінамоўная літаратура

Мікола Гусоўскі і яго «Песня пра зубра»

Ян Вісліцкі і яго паэма «Пруская вайна»

Паварот да роднай мовы

Францыск Скарына

Рэфармацыя – пералом у духоўным жыцці еўрапейцаў

«Катэхізіс» Марціна Лютэра

Сымон Будны

Васіль Цяпінскі

Панегірычная паэзія. Творчасць Андрэя Рымшы

Гераічна-эпічная паэзія. Творы польска- і лацінамоўных паэтаў ВКЛ

Гістарычна-мемуарная літаратура Беларусі канца XVI – пачатку XVII ст.

Адраджэнне ў Іспаніі

Сервантэс

Адраджэнне ў Англіі

Англійскі тэатр Адраджэння

Уільям Шэкспір

## Творы мастацтва

1. Мікельанджэла. Стварэнне Адама. Купал сабора св. Пятра ў Рыме. Давід
2. Леанарда да Вінчы. Джаконда. Таемная вячэра
3. Рафаэль. Сікстынская мадонна
4. Джарджонэ. Юдзіф
5. Дж. Палестрына. Меса папы Марчэла
6. Е. Босх. Воз сена
7. А. Дзюрэр. Аўтапартрэт. Рыцар, Смерць і Д’ябал
8. Л. Кранах. Адам і Ева
9. Ф. Клюэ. Партрэт караля Карла IX
10. К. Жанекен. Спеў птушак
11. Тыцыян. Даная
12. Джэзуальда. Мадрыгал «Пакутую бясконца…»
13. П. Брэйгель-ст. Сляпцы
14. А. Ласа. «Bonjor, mon coeur»
15. Мірскі замак
16. Замак Радзівілаў у Нясвіжы
17. Пакланенне вешчуноў (абраз з Браслаўшчыны)
18. Партрэт Юрыя Радзівіла
19. Рыгор (Гжэгаж) (скульптура)
20. Кант «Было ў Ліцвінцы…»
21. В. Длугарай. Танец (№ 1)

## Літаратурныя творы

П. дэ Рансар. Вершы
Ян Каханоўскі. Фрашкі, трэны
Мікола Гусоўскі. Песня пра зубра
Ян Вісліцкі. Пруская вайна
Ф. Скарына. Прадмова да ўсёй Бібліі. Прадмова да кнігі «Юдзіф». Вершы
М. Лютэр. Катэхізіс.
С. Будны. Катэхізіс з прадмовай
В. Цяпінскі. Прадмова да Евангелляў
А. Рымша. Эпікграмы. Дэкатэрас
М. Стрыйкоўскі. Кроніка Польская, Літоўская, Жамойцкая і ўсёй Русі
Л. Сапега. Зварот да ўсіх саслоўяў…
М. дэ Сервантэс. Дон-Кіхот
У. Шэкспір. Санеты. Гамлет

## Творы да кантэксту эпохі

Уладзімір Караткевіч. Скарына пакідае радзіму. Прарок Геронім Босх
Янка Юхнавец. Калумбы
Людміла Рублеўская. Паляванне каралевы Боны
Валянціна Аксак. Мелодыя для лютні
Уладзімір Арлоў. Час чумы

## Літаратура да тэмы

1. Адамовіч Г. Я. З крыніц сусветнай літаратуры: Дапам. для наст. Мн.: БелЭн, 1998. С. 153–229.
2. Адамовіч Г. Я. Літаратурная класіка: Дапаможнік. Мн.: БДПУ, 2009. С. 66–70.
3. Анталогія беларускай паэзіі. Т. 1 / Укл. А. Мальдзіс і інш. Мн.: Маст. літ., 1993. С. 42–54.

4. Багаславі сустрэчу мне… Выбр. лірыка паэтаў Плеяды / Пер. і прадм. Н. Мацяш. Берасьце [б. в.], 2001.
5. Баршчэўскі Л. Літаратура ад старажытнасці да пачатку эпохі рамантызму. Мн.: Сэр-Віт, 2003. С. 131–210, 375–379.
6. Беларусы. Т. 11: Музыка / Т. Б. Варфаламеева і інш.. Мн.: Бел. навука, 2008. С. 341–350.
7. Бэрк П. Рэнесанс / Пер. з англ. А. Арловай. Мн.: БГАКЦ, 1997.
8. Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў. Т. 1 / Нав. рэд. тома В. А. Чамярыцкі. Мн.: Бел. навука, 2006. С. 259–492.
9. Дадзіёмава В. Нарысы гісторыі музычнай культуры Беларусі. Мн.: Бел. дзярж. Акадэмія музыкі, 2000. С. 14–37.
10. Дожджыкава Р. Асветнікі Беларусі: Мікола Гусоўскі, Сімяон Полацкі, Афанасій Філіповіч. Мн.: БелЭн, 2017. С. 4–25.
11. Дубянецкі Э. Асветнікі Беларусі: Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Францыск Скарына. Мн.: БелЭн, 2016. С. 48–71.
12. Дубянецкі Э. Асветнікі Беларусі: Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Іпацій Пацей. Мн.: БелЭн, 2016. С. 3–45.
13. Дубянецкі Э. С. Сусветная культура: Ад старажытнасці да нашых дзён. Мн.: БелЭн, 2001. С. 151–174.
14. Захарына Ю. Ю., Зелянеўская С. М. Сусветная мастацкая культура. Ч. 2. Ад Адраджэння да пач. XXI ст. Мн.: БДПУ, 2011. С. 12–39.
15. І боль, і прыгажосць… Выбр. тв. паэтаў Еўропы і Амерыкі ў перакладах Лявона Баршчэўскага. Мн.: Зміцер Колас, 2016. С. 64–75.
16. Кавалёў С. Літаратура Вялікага Княства Літоўскага XVI – пачатку XVII ст. Мн.: Кнігазбор, 2011.
17. Кавалёў С. Шматмоўная паэзія Вялікага Княства Літоўскага эпохі Рэнесансу. Мн.: Кнігазбор, 2010.
18. Катэхізіс. Помнік беларускай Рэфармацыі XVI стагоддзя / Пер. Н. Кабелкі. Мн.: Юніпак, 2005.
19. Каханоўскі Я. Выбранае / Пер. А. Хадановіча, Л. Баршчэўскага. Мн.: Зм. Колас, 2017.
20. Лазука Б. А. Гісторыя беларускага мастацтва. Т. І: Першабытны лад – XVII стагоддзе. Мн.: Беларусь, 2007. С. 122–128, 135–143, 150–159, 163–175.

21. Лазука Б. А. Гісторыя сусветнага мастацтва. Ад старажытных часоў па XVI стагоддзе. Мн.: Беларусь, 2010. С. 163–214, 247–308.
22. Літаратура XI–XVI стагоддзяў. Т. 1. / Нав. рэд. В. А. Чамярыцкі. Мн.: Маст. літ., 2012. С. 167–574.
23. Лютэр М. Вялікі Катэхізіс / Пер. М. Бадрусёва. Мн.: ПРЫНТ-КОРП, 2006.
24. Мастацтва. Вучэб. дапам.-хрэстаматыя для 9 кл. / Аўт.-укл. Т. Я. Вазінская. Мн.: Лімарыус, 1997. С. 160–168, 176–219, 231–242, 250–257.
25. Рагойша В. П., Кабржыцкая Т. В. і інш. Беларуская літаратура: Вучэбн. дапам. для 10 кл. агульнаадукац. шк. з профільн. і паглыбл. вывучэннем бел. літ., ліцэяў, гімназій. Мн.: Нар. асвета, 2001. С. 209–250.
26. Разанаў А. Кніга ўзнаўленняў. Мн.: Логвінаў, 2005. С. 19–86.
27. Разанаў А. Маем найбольшае самі. Мн.: Мн.: Маст. літ., 2017.
28. Родная літаратура: Хрэстаматыя для 10 кл. сярэдняй школы / Скл. М. А. Лазарук, Л. К. Цітова, В. У. Івашын. Мн.: Маст. літ., 1997. С. 112–203.
29. Сасноўскі Зм. Гісторыя беларускай музычнай культуры: Ад старажытнасці да канца XVIII стагоддзя. Мн.: Харвест, 2010. С. 86–205.
30. Славянамоўная паэзія Вялікага Княства Літоўскага XVI–XVIII стст. / Укл, прадм. і камент. А. Бразгунова. Мн.: Бел. навука, 2011. С. 42–55, 185–247, 325–489.
31. Снапкоўская С. В., Вараб'ёва В. А. і інш. Асновы культуралогіі: Канспект лекцый. Мн.: Асар, 2008. С. 59–70.
32. Старажытная беларуская літаратура (XII–XVII стст.). Мн.: Кнігазбор, 2007. С. 114–253.
33. Трусаў А. Кароткая гісторыя архітэктуры Беларусі. Мн.: Харвест, 2015. С. 133–222.
34. Тысячи лет музыки: Пособие для учителя ОМХК / 8 кл. Фонохрестоматия (на 3-х CD) / Авт.-сост. В. Д. Юркевич. Мн.: Новое знание, 2007. С. 17–28, 52–58 (+Запіс: CD 1, №№ 23, 24, 25, 26, CD 3, №№ 7, 29, 30).

35. Харэўскі С. Гісторыя мастацтва і дойлідства Беларусі. Вільня: ЕГУ, 2007. С. 51–67.
36. Хрэстаматыя па літаратуры народаў свету: Кн. у дапамогу тым, хто вывучае сусветную літаратуру. 9 кл. Ч. 1. Мн.: БГАКЦ, 1995. С. 273–426.

## ПОСТРЭНЕСАНС. БАРОКА І КЛАСІЦЫЗМ У ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВЕ

Асаблівасці паслярэнесансавага развіцця еўрапейскай культуры. Барока і класіцызм.

Развіццё барочнай традыцыі. Маньерызм і барока. Асаблівасці архітэктуры, жывапісу, скульптуры. Музыка барока – вяршыня поліфаніі. Тэатр «камедыі дэль артэ».

Асаблівасці літаратуры барока. Паэты-«метафізікі»

Літаратура і мастацтва барока ў Беларусі: упоравень з еўрапейскай культурай. Раннія помнікі барочнай архітэктуры. Беларуская школа іканапісу. Развіццё сармацкага партрэта. Кніжная графіка. Тэатр батлейкі. Школьны тэатр.

Літаратура перыяду Контррэфармацыі.

Царкоўна-палемічная публіцыстыка

Палемічная паэзія розных рэлігійных напрамкаў

Полацкая школа паэтаў барока.

Мацей Казімір Сарбеўскі

Сімяон Полацкі

Андрэй Белабоцкі

Разбурэнне «высокага штылю» ў паэзіі позняга барока.

Дамінік Рудніцкі

Грамадска-філасофская лірыка

Песенна-інтымная лірыка

Палітычная сатыра

Школьная драматургія

Літаратура і мастацтва класіцызму.
Нікаля Буало і яго «Паэтычнае майстэрства»
Ж.-Б. Мальер і яго камедыі

## Творы мастацтва

Сабор і плошча св. Пятра ў Рыме
Рэмбрант ван Рэйн. Вяртанне блуднага сына
П. Рубенс. Святы Георгій ў бітве з цмокам
Караваджа. Лютніст
Эль Грэка. Святыя апосталы Пётр і Павел
Д. Веласкес. Меніны
Я. Бернардоні. Касцёл Божага Цела ў Нясвіжы
«Дом на рынку» ў Нясвіжы
Маці Боская Адзігітрыя Неўвядальны Квет (абраз)
Б. Стробель. Партрэт Януша Радзівіла
А. Тарасевіч. Малітвы і службы Маці Боскай Марыі…
Я. Перы. Эўрыдыка (опера)
К. Мантэвердзі. Арфей (опера)
А. Вівальдзі. Поры года
Ё. С. Бах. Таката і фуга рэ-мінор
Полацкі сшытак
Мілыя вочы (беларускі мадрыгал)
Н. Пусэн. Выкраданне сабінянак
Л. Лево, А. Ленотр, Ж.-А. Мансар. Версальскі палац
Ф. Жырардон. Апалон і німфы
Ж.-Б. Люлі. Альцэст (опера)

## Літаратурныя творы

Дж. Дон. Падлікі
Дж. Герберт. Адкупленне
Дж. Мілтан. Страчаны рай.
Г. Пельгрымоўскі. Гутарка аднаго паляка з маскалём…
Баркулабаўская хроніка

Я. К. Пашкевіч. «Польска квітнет лаціною…»
Пётр Скарга. Сеймавыя казанні: Казанне другое
Іпацій Пацей. Справядлівае апісанне ўчынку і справы Сінодавай...
Мялецій Сматрыцкі. Трэнас
Афанасій Філіповіч. Песнь ка Хрысту…
Вітанне на першы прыезд з Караляўца… Хэрн-Лютэрмахра
С. Полацкі. Змяя. Песенька пра смерць
Прамова Мялешкі
Ц. Камуняка. Ліст да Абуховіча
К. Пянткоўскі. Цімон Гардзілюд
Н. Буало. Паэтычнае майстэрства
Ж.-Б. Мальер. Тарцюф

## Творы да кантэксту эпохі

Максім Танк. Дом Рэмбранта
Анатоль Сыс. Маналог Апанаса Філіповіча
Кастусь Тарасаў. На вайне
Л. Рублеўская. Мялецій Сматрыцкі

## Літаратура да тэмы


1. Адамовіч Г. Я. З крыніц сусветнай літаратуры: Дапам. для наст. Мн.: БелЭн, 1998. С. 230–252.
2. Адамовіч Г. Я. Літаратурная класіка: Дапаможнік. Мн.: БДПУ, 2009. С. 146–153.
3. Анталогія беларускай паэзіі. Т. 1 / Укл. А. Мальдзіс і інш. Мн.: Маст. літ., 1993. С. 68–113.
4. Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVII ст. Мн.: Бел. навука, 2003. С. 593–832.
5. Барока ў беларускай культуры і мастацтве / Навук. рэд. В. Ф. Шматаў. Мн.: Бел. навука, 2001.
6. Баршчэўскі Л. Літаратура ад старажытнасці да пачатку эпохі рамантызму. Мн.: Сэр-Віт, 2003. С. 211–248, 381–412.

7. Беларусы. Т. 11: Музыка / Т. Б. Варфаламеева і інш.. Мн.: Бел. навука, 2008. С. 350–369.
8. Беларусы. Т. 13: Тэатральнае мастацтва / Р. Б. Смольскі і інш.. Мн.: Бел. навука, 2012. С. 38–52.
9. Бэрк П. Народная культура Эўропы ранняга Новага часу / Пер. з англ. І. Ганэцкай. Мн.: Тэхналогія, 1999.
10. Габрусь Т. В. Мураваныя харалы: Сакральная архітэктура беларускага барока. Мн.: Ураджай, 2001.
11. Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў. Т. 1 / Нав. рэд. тома В. А. Чамярыцкі. Мн.: Бел. навука, 2006. С. 493–681, 748–768.
12. Дожджыкава Р. Асветнікі Беларусі: Мікола Гусоўскі, Сімяон Полацкі, Афанасій Філіповіч. Мн.: БелЭн, 2017. С. 26–71.
13. Дубянецкі Э. Асветнікі Беларусі: Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Іпацій Пацей. Мн.: БелЭн, 2016. С. 46–70.
14. Дубянецкі Э. С. Сусветная культура: Ад старажытнасці да нашых дзён. Мн.: БелЭн, 2001. С. 175–186.
15. Захарына Ю. Ю., Зелянеўская С. М. Сусветная мастацкая культура. Ч. 2. Ад Адраджэння да пач. XXI ст. Мн.: БДПУ, 2011. С. 40–69.
16. І боль, і прыгажосць… Выбр. тв. паэтаў Еўропы і Амерыкі ў перакладах Лявона Баршчэўскага. Мн.: Зміцер Колас, 2016. С. 76–91.
17. Коллинз С. Классическая музыка от и до. Пространство, наполненное гармонией / Пер. с англ. Москва: ФАИР-ПРЕСС, 2000. С. 137–160.
18. Лазука Б. А. Гісторыя беларускага мастацтва. Т. І: Першабытны лад – XVII стагоддзе.Мн.: Беларусь, 2007. С. 178–252.
19. Лазука Б. А. Гісторыя сусветнага мастацтва. XVII–XVIII стагоддзе. Мн.: Беларусь, 2010. С. 6–113.
20. Літаратура XVII–XVIII стагоддзяў. Т. 2. / Нав. рэд. В. А. Чамярыцкі. Мн.: Маст. літ., 2012. С. 3–291, 358–432, 574–579.
21. Літаратура народаў свету: Хрэст. для 10 кл. / Укл. Л. П. Баршчэўскі. Ч. 1. Мн.: БГАКЦ, 1995. С. 339–429.

22. Мастацтва. Вучэб. дапам.-хрэстаматыя для 9 кл. / Аўт.-укл. Т. Я. Вазінская. Мн.: Лімарыус, 1997. С. 267–344, 425–437.
23. Мастацтва. Вучэб. дапам.-хрэстаматыя для 10 кл. / Аўт.-укл. Г. В. Наполава. Мн.: Піан, 1998. С. 34–37.
24. Міско С. М. Школьны тэатр Беларусі XVI–XVIII стст. Мн.: Тэсей, 2000. С. 4–64.
25. Рагойша В. П., Кабржыцкая Т. В. і інш. Беларуская літаратура: Вучэбн. дапам. для 10 кл. агульнаадукац. шк. з профільн. і паглыбл. вывучэннем бел. літ., ліцэяў, гімназій. Мн.: Нар. асвета, 2001. С. 251–263.
26. Разанаў А. Кніга ўзнаўленняў. Мн.: Логвінаў, 2005. С. 89–132.
27. Родная літаратура: Хрэстаматыя для 10 кл. сярэдняй школы / Скл. М. А. Лазарук, Л. К. Цітова, В. У. Івашын. Мн.: Маст. літ., 1997. С. 187–197, 199–203, 227–240..
28. Сасноўскі Зм. Гісторыя беларускай музычнай культуры: Ад старажытнасці да канца XVIII стагоддзя. Мн.: Харвест, 2010. С. 206–209.
29. Славянамоўная паэзія Вялікага Княства Літоўскага XVI–XVIII стст. / Укл, прадм. і камент. А. Бразгунова. Мн.: Бел. навука, 2011. С. 66–81, 490–759.
30. Снапкоўская С. В., Вараб'ёва В. А. і інш. Асновы культуралогіі: Канспект лекцый. Мн.: Асар, 2008. С. 71–77.
31. Тысячи лет музыки: Пособие для учителя ОМХК / 8 кл. Фонохрестоматия (на 3-х CD) / Авт.-сост. В. Д. Юркевич. Мн.: Новое знание, 2007. С. 29–45, 54–56 (+Запіс: CD 2, №№ 3–5, 11, 21–25; CD 3, №№ 9–15, 27).
32. Харэўскі С. Гісторыя мастацтва і дойлідства Беларусі. Вільня: ЕГУ, 2007. С. 68–90.
33. Яцухна В. І. Тэорыя літаратуры: Дапаможнік. Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2006. С. 198–204.
34. Bach. Mistrz baroku. International Masters Publishers BV MMV, [s. a.]. (+Запіс: CD, № 5).

# ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА ЭПОХІ АСВЕТНІЦТВА

Светапогляд і дзейнасць асветнікаў. Асветніцкія ідэі ў літаратуры і мастацтве Еўропы. Мастацтва позняга барока, ракако, позняга класіцызму. Расійскі класіцызм. Венская класічная школа ў музыцы. Рэформы еўрапейскага тэатральнага мастацтва. Асветніцтва ў Беларусі. Дзейнасць езуітаў. Архітэктура віленскага барока. Палацава-замкавыя ансамблі. Алтарная скульптура. Жывапіс: роспісы храмаў, мастацтва партрэта. Музыка і музычнае тэатральнае мастацтва. Дэкаратыўна-ўжытковае мастацтва: слуцкія паясы

Асаблівасці літаратуры эпохі Асветніцтва.

Асветніцкі класіцызм.

Бамаршэ і яго камедыя «Жаніцьба Фігаро»

Паэзія Міхайлы Ламаносава

Каятан Марашэўскі. «Камедыя»

Асветніцкі рэалізм.

Дэніэл Дэфо. «Рабінзон Круза»

Гістарычныя драмы Фрыдрыха Шылера

Саламея Пільштынова-Русецкая. «Авантуры майго жыцця»

Сентыменталізм

Крысціёнас Данялайціс. «Чатыры пары года»

Роберт Бёрнс

Францішак Дыянізі Князьнін

Творчасць Ё. В. Гётэ як вяршыня літаратуры Асветніцтва

Літаратура і мастацтва на мяжы XVIII і XIX стагоддзяў

## Творы мастацтва

Ж. А. Габрыэль. Малы Трыянон у Версалі

Ж. А. Гудон. Вальтэр

А. Вато. Жыль

У. Хогарт. Дзяўчына з крэветкамі

Ф.-Б. Растрэлі. Зімовы палац у Пецярбургу

А. Ласенка. Уладзімір і Рагнеда
У. Баравікоўскі. Партрэт М. Лапухіной
Я. Глаўбіц. Сабор Святой Сафіі ў Полацку (перабудова)
Ф. Гескі Тайная вячэра (алтарны абраз у Нясвіжы)
Г. Лішэўская Партрэт Міхала Агінскага
Я. Шміт і інш. Алтар касцёла св. Ксаверыя ў Гродне
Слуцкія паясы
Г. Ф. Гендэль. Музыка да феерверкаў
В. А. Моцарт. Сімфонія № 40. Рэквіем (Lacrimosa))
Л. ван Бетховен. Для Элізы
Я. Голанд. Агатка (опера)
Міхал Казімір Агінскі. Да Касі (вакальны цыкл)
Т. Касцюшка. Паланэз.

## Літаратурныя творы

І. Кант. Адказ на пытанне: што ёсць Асветніцтва?
П. дэ Бамаршэ. Жаніцьба Фігаро.
М. Ламаносаў. Ода
Дз. Фанвізін. Недарасль
Д. Рудніцкі. Ваенны паход грыбоў
К. Марашэўскі. Камедыя
Д. Дэфо. Рабінзон Круза
С. Пільштынова-Русецкая. Авантуры майго жыцця
К. Данялайціс. Чатыры пары года
«Сам я не знаю, як на свеце жыці…»
«Было ж спярша й не любіці…»
Ф. У. Радзівіл. Верш пра каханне
Ф. Д. Князьнін. Кросенцы
Песня беларускіх жаўнераў 1794 года
Ф. Шылер. Песня да радасці. Дзімітрый
Ё. В. Гётэ. Боскае. Міньён (цыкл). Пясняр. Фаўст.

## Творы да кантэксту эпохі

Уладзімір Арлоў. Архіварыюс Война
Юзаф Ігнацы Крашэўскі. Кароль у Нясвіжы
Кастусь Тарасаў. Скарбы князёў Радзівілаў

## Літаратура да тэмы


1. Адамовіч Г. Я. З крыніц сусветнай літаратуры: Дапам. для наст. Мн.: БелЭн, 1998. С. 253–316.
2. Адамовіч Г. Я. Літаратурная класіка: Дапаможнік. Мн.: БДПУ, 2009. С. 153–156.
3. Анталогія беларускай паэзіі. Т. 1 / Укл. А. Мальдзіс і інш. Мн.: Маст. літ., 1993. С. 113–134.
4. Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVII ст. Мн.: Бел. навука, 2003. С. 833–866.
5. Баршчэўскі Л. Літаратура ад старажытнасці да пачатку эпохі рамантызму. Мн.: Сэр-Віт, 2003. С. 250–318, 413–470.
6. Беларуская літаратура: Вуч. дапам. для 9 кл. агульнаадукац. шк. (паглыбл. узровень). Ч. 1. Мн.: Маст. літ., 2006. С. 229–236.
7. Беларуская літаратура XVIII–XIX стагоддзяў: Зб. тэкстаў / Скл. М. В. Хаўстовіч. Мн.: БДУ, 2000. С. 5–133.
8. Беларусы. Т. 11: Музыка / Т. Б. Варфаламеева і інш.. Мн.: Бел. навука, 2008. С. 369–399.
9. Беларусы. Т. 13: Тэатральнае мастацтва / Р. Б. Смольскі і інш.. Мн.: Бел. навука, 2012. С. 74–84.
10. Блахіна Л. В., Вазінская Т. Я. і інш Айчынная і сусветная мастацкая культура: Вучэбн. дапам. для 9 кл. Мн.: Беларусь, 2006. С. 3–30, 81–87, 98–99.
11. Гётэ Ё. В. Выбраная паэзія / Пер. В. Сёмухі і Л. Баршчэўскага. Мн.: Зм. Колас, 2016.
12. Гётэ Ё. В. Выбраныя творы / Прадм. П. Копанева і Л. Баршчэўскага. Мн.: Бел. кнігазбор, 1999.
13. Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў. Т. 1 / Нав. рэд. тома В. А. Чамярыцкі. Мн.: Бел. навука, 2006. С. 824–875.

14. Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў. Т. 2 / Нав. рэд. тома У. І. Мархель і В. А. Чамярыцкі. Мн.: Бел. навука, 2007. С. 8–66.
15. Дадзіёмава В. Нарысы гісторыі музычнай культуры Беларусі. Мн.: Бел. дзярж. Акадэмія музыкі, 2000. С. 64–174.
16. Дубянецкі Э. С. Сусветная культура: Ад старажытнасці да нашых дзён. Мн.: БелЭн, 2001. С. 187–198.
17. Захарына Ю. Ю., Зелянеўская С. М. Сусветная мастацкая культура. Ч. 2. Ад Адраджэння да пач. XXI ст. Мн.: БДПУ, 2011. С. 70–92.
18. І боль, і прыгажосць… Выбр. тв. паэтаў Еўропы і Амерыкі ў перакладах Лявона Баршчэўскага. Мн.: Зм. Колас, 2016. С. 92–119.
19. Коллинз С. Классическая музыка от и до. Пространство, наполненное гармонией / Пер. с англ. Москва: ФАИР-ПРЕСС, 2000. С. 160–184.
20. Лазука Б. А. Гісторыя беларускага мастацтва. Т. II: XVIII – пач. XXI ст. Мн.: Беларусь, 2007. С. 81–114.
21. Лазука Б. А. Гісторыя сусветнага мастацтва. XVII–XVIII стагоддзе. Мн.: Беларусь, 2010. С. 114–251.
22. Літаратура XVII–XVIII стагоддзяў. Т. 2. / Нав. рэд. В. А. Чамярыцкі. Мн.: Маст. літ., 2012. С. 310–357, 447–518, 612–680.
23. Літаратура народаў свету: Хрэст. для 10 кл. / Укл. Л. П. Баршчэўскі. Ч. 1. Мн.: БГАКЦ, 1995. С. 280–338.
24. Мастацтва. Вучэб. дапам.-хрэстаматыя для 9 кл. / Аўт.-укл. Т. Я. Вазінская. Мн.: Лімарыус, 1997. С. 267–344, 425–437.
25. Мастацтва. Вучэб. дапам.-хрэстаматыя для 10 кл. / Аўт.-укл. Г. В. Наполава. Мн.: Піан, 1998. С. 4–34, 37–60, 64–87.
26. Музыка Беларусі XVIII стагоддзя. Мн.: Дзярж. музей гіст. тэатр. і музычн. культуры, 2008 (CD 1, запісы: №№ 6–14; CD 2, запісы №№ 1–7; біягр. звесткі пра кампазітараў В. У. Дадзіёмавай).
27. Рагойша В. П., Кабржыцкая Т. В. і інш. Беларуская літаратура: Вучэбн. дапам. для 10 кл. агульнаадукац. шк. з профільн. і паглыбл. вывучэннем бел. літ., ліцэяў, гімназій. Мн.: Нар. асвета, 2001. С. 264–299.

28. Сасноўскі Зм. Гісторыя беларускай музычнай культуры: Ад старажытнасці да канца XVIII стагоддзя. Мн.: Харвест, 2010. С. 209–322.
29. Славянамоўная паэзія Вялікага Княства Літоўскага XVI–XVIII стст. / Укл, прадм. і камент. А. Бразгунова. Мн.: Бел. навука, 2011. С. 760–839.
30. Снапкоўская С. В., Вараб'ёва В. А. і інш. Асновы культуралогіі: Канспект лекцый. Мн.: Асар, 2008. С. 78–87.
31. Харэўскі С. Гісторыя мастацтва і дойлідства Беларусі. Вільня: ЕГУ, 2007. С. 91–119.
32. Classic 2 (CD, 1000 original hits, vol. 42). Мн.: УП «Арт-классик», 2007 (Запісы: №№ 01, 05).
33. Інтэрнэт-рэсурсы (музыка Г. Ф. Гендэля і В. А. Моцарта)
http://poiskm.net/show/гендель/музыка-фейерверка
http://poiskm.net/show/моцарт/реквием-лакримоза

## Творы для завучвання на памяць

Сапфо. Гімн Афрадыце (у перакладзе Л. Баршчэўскага)
Гарацый. Памятнік [Да Мельпамены] (у перакладзе М. Багдановіча)
Умар Хаям. 4–5 рубаі (у перакладзе Р. Барадуліна)
Кніга Быцця (Роду): 1: 1–5 (у перакладзе В. Сёмухі або І. Дубянецкай)
М. Гусоўскі. Урывак з «Песні пра зубра» (у перакладзе Ул. Шатона, Н. Арсенневай або Я. Семяжона)
Ф. Скарына. Урывак з прадмовы да кнігі «Юдзіф» (у арыгінале або ў пераказе А. Разанава)
У. Шэкспір. Гамлет (урывак, у перакладзе Ю. Гаўрука), санет 66 (у перакладзе Р. Барадуліна або У. Дубоўкі)
Ф. Шылер. Дзімітрый (урывак з маналога Льва Сапегі ў перакладзе Л. Баршчэўскага)
Ё. В. Гётэ. Верш на выбар (у любых перакладах), урывак з трагедыі «Фаўст» (у перакладзе В. Сёмухі)

## Тэрміны з мастацтвазнаўства, літаратуразнаўства, філасофіі, якія навучэнцы павінны засвоіць да канца II этапу навучання ў ліцэі

Абраз (ікона), агіяграфія, акварэль, акорд, аксюмаран, актор / акцёр, алегорыя, алітарацыйны верш, алітарацыя, алтар, амбон / амвон, амфібрахій, амфітэатр, анапест, антрапамарфізм, антрапацэнтрызм, антытэза, антычнасць, апавяданне, аповесць, апокрыф, апсіда, арка (выгба), аркада, арнамент, архаіка, арыя, асананс, Асветніцтва, базіліка, байка, балюстрада, барока, барэльеф, батлейка, Біблія, бюст, вадэвіль, вакальны твор, вакальны цыкл, вежа, візантыйскі стыль, вільчык, вітраж, вобраз мастацкі, выяўленчае мастацтва, габелен, галерэя, гама, гармонія мастацкая, гекзаметр, геральдыка, гімн, гіпербала, гістрыён, готыка, гравюра, гратэск, графіка, гуманізм, дактыль, дальмен, данжон, дахоўка, дзядзінец, дойлідства (архітэктура), драма, драматургія, дрэварыт, дыван, дыпціх, дэкаратыўна-ўжытковае мастацтва, дэкарацыя, жанр (літаратурны, мастацкі), жывапіс, жыціе, закамара, замак, збор (пратэстанцкі), званіца, «звярыная гратэска», зікурат, ідэя (мастацкая) твора, іканапіс, іканастас, ілюстрацыя кніжная, інтэр’ер, інтэрмедыя, какошнік, каланада, каларыстыка, каларыт, калона, камедыя антычная, камедыя дэль артэ, камедыя «плашча і шпагі», кампазіцыя твора, кандак, канон, кансона / канцона, кант, кантраст, канцыянал, капітэль, капліца, капэла, Каран, карніз, касцёл, катарсіс, кафля, кераміка, класіцызм, класіцызм асветніцкі, кляштар, Контррэфармацыя, контрфорс, кромлех, культура, кунтуш, купал, куфар, лейтматыў, летапіс (кроніка), лібрэта, лірыка, літаграфія, літаратура, мадрыгал, маёліка, мазаіка, малітва, манастыр, манументальнае мастацтва, маньерызм, маралітэ, мастацтва, матэт, медзярыт, меса, метафара, метанімія, метафізіка, міміка, мінарэт, мі-

ракль, містэрыя, міф, міфалогія, музыка, мячэць, навела, надмагілле, накід, напрамак / плынь (у літаратуры, мастацтве), нацюрморт, нервюра, неўмы, неф, ніша, нотапісанне, ноты, опера, опера-балет, ордар (дарычны, іанічны, карынфскі), павільён, палітра, паліхромія, памфлет, панегірык, пáрад, парадокс, паралелізм (літаратурны), партал, партрэт, пастараль (ідылія) палац, памер літаратурны, пахавальня, пацір, паэтыка, пейзаж, пентаметр, перыфраз, песня, піктаграфія, пілястра, піраміда, пластыка, плафон, плінфа, плябанія, політэізм, поліфанія, порцік, Пострэнесанс, пояс слуцкі, праблематыка твора, проза, Протарэнесанс, прыпавесць (прытча, парабала), прытвор, прэсбітэрый, пячатка, псалом / псальма, ракако, раман, раманскі стыль, ратонда, рацыяналізм, род літаратурны, роспіс, рубаі, рызніца, рытм (у літаратуры і музыцы), рытуал, рыфма (мужчынская, жаночая, дактылічная; парная, перакрыжаваная, кальцавая), ручнік, рэалізм рэнесансавы, рэалізм барочны, рэалізм асветніцкі, рэльеф, Рэнесанс (Адраджэнне), рэтраспекцыя, Рэфармацыя, рэфлексія, сага, санет, свет мастацкі, сентыменталізм, сілаба-танічны верш, сілабічны верш, сімвал, сінагога, сінекдаха, скамарох, скляпенне, скульптура, слова (літаратурны жанр), смальта, спеў харавы, спічак (шпіль), стаіцызм, стапа, стасім, страфа, строй (касцюм), стыль (у літаратуры, мастацтве), сутарэнне, сучасны тып літаратуры, сцэнаграфія, сэнсуалізм, Сярэднявечча (ранняе, Высокае, позняе), сцэна, таката, тамізм, танальнасць, Танах, ткацтва, тон, травестацыя, трагедыя антычная, трагізм, трапар, троп, трох адзінстваў правіла, трыпціх, трэн (трэнас, фрынас), тэатр, тэацэнтрызм, тэма (у мастацкім творы), тэраса, тэрцына, уверцюра, фарс, фарфор (парцаляна), франтон, фрашка, фрыз, фрэска, фуга, хаджэнне, харал, харал грыгарыянскі, харэй, хор, храм крыжова-купальны, храм-крэпасць, цокаль, чаканка, , эклектыка, эксад, элегічны двуверш, элегія, эпас антычны, эпас сярэднявечны, эпісодый, эпіталама, эстэтыка, эўфемізм, ямб, ярус.

## Прыкладная тэматыка сачыненняў, водгукаў і эсэ

1) Узнікненне мастацтва: як я гэта сабе ўяўляю.
2) Мастацтва ў даўнія часы і сёння.
3) Мой адзін дзень у Егіпце.
4) Вечныя гарады: Ерусалім, Рым.
5) «Сем цудаў свету» з сённяшняга гледзішча.
6) На спектаклі паводле Сафокла (Эўрыпіда) у старажытным амфітэатры.
7) Перанясемся ў сярэднявечны Канстанцінопаль.
8) Полацкая гісторыя і жыццё святой Еўфрасінні.
9) Наведаўшы старажытны Полацк…
10) Слухаю казанне Кірылы Тураўскага.
11) Чароўны свет готыкі.
12) Я – спадарожнік Скарыны (Гусоўскага)…
13) Змаганне за мову: ад паэтаў «Плеяды» да Ф. Багушэвіча.
14) Тытаны Рэнесансу і я.
15) Мае ўражанні ад Мірскага замка (палаца Радзівілаў).
16) Я ў барочным храме.
17) Слухаю старадаўні арган.
18) Гляджу батлейку.
19) На спектаклі паводле п’есы Сяргея Кавалёва…
20) Мне б хацелася перанесціся ў … стагоддзе.

# АЎТАРСКАЯ ПРАГРАМА

вывучэння курса

## Геаграфія
## (глабальныя праблемы чалавецтва)

*у гуманітарным ліцэі*
*з беларускай мовай навучання*

Складальнік:
*Павел Церашковіч,*
кандыдат гістарычных навук

# УСТУП

Вывучэнне глабальных праблем чалавецтва (global issues, global challenges) – параўнальна новая даследніцкая і дыдактычная тэматыка. Дакладнага канвенцыянальнага вызначэння зместу гэтых феноменаў няма. Разам з тым, большасць экспертаў пагаджаецца з тым, што да глабальных адносяцца праблемы, якія не здольныя вырашыць нацыянальныя дзяржавы паасобку. Больш за тое, гэта менавіта такога ўзроўню выклікі, ужыванне да якіх звыклых працэдур з арсеналу міжнародных адносінаў не дае чаканых вынікаў. Вырашэнне глабальных праблем патрабуе не толькі наднацыянальнага, але і трансдысцыплінарнага і трансінстытуцыянальнага падыходу. Трансдыцыплінарнасць азначае спалучэнне розных галін ведаў, ўключаючы экалогію, геаграфію, паліталогію, футуралогію, эдукалогію, сацыялогію і г. д. Трансінстытуцыянальнасць – гэта супрацоўніцтва органаў дзяржаўнай ўлады, навуковых цэнтраў, грамадскіх ініцыятыў і г. д. Пры гэтым асаблівая роля адводзіцца сістэме адукацыі, якая абавязана фармаваць адпаведныя глабальным выклікам кампетэнцыі, у першую чаргу, здольнасць да глабальнага мыслення.

Трэба адзначыць, што беларуская акадэмічная супольнасць досыць аператыўна і адэкватна рэагуе на выклік актуалізацыі вывучэння глабальных праблем чалавецтва ў сярэдняй школе. Так, у 2016 г. з'явіўся новы падручнік для 11 класа «Геаграфія. Сусветная гаспадарка і глабальныя праблемы чалавецтва» (аўтары: Вітчанка А., Анціпава К., Озем Г., Станкевіч Н.), які ўяўляе сабою значны крок наперад ва ўключэнні праблематыкі global issues у структуру айчынных навучальных планаў. Разам з тым, аўтары засталіся, што абсалютна зразумела, у межах

геаграфічнага падыходу. У сувязі з гэтым некаторыя з глабальных праблем, напрыклад, праблема сацыяльнай няроўнасці і беднасці, доступу да якаснай адукацыі, інстытуты глабальнага кіравання, засталіся па-за ўвагай аўтараў згаданага дапаможніка. Шмат якія раздзелы падручніка выглядаюць празмерна схематычнымі, пазбаўленыя жывога кантэксту рэчаіснасці. Хапае і абсалютна недарэчных памылак. Выклікае шчырае неразуменне, і нават рашучую нязгоду, уключэнне ў падручнік параграфа, прысвечанага геапалітыцы. Яна трактуецца як ледзьве не адзіная канцэпцыя вывучэння міжнародных адносінаў. Усё гэта выклікае патрэбу ў складанні альтэрнатыўнай, ці, хутчэй, дадатковай навучальнай праграмы, арыентаванай на трансдысцыплінарны падыход.

Праграма, якая прапануецца ніжэй, заснаваная на напрацоўках некалькіх аўтарытэтных міжнародных арганізацый. Сярод іх перш за ўсе трэба адзначыць «Мэты ўстойлівага развіцця» – праграму Арганізацыі Аб'яднаных Нацый «Пераўтвараючы наш свет: парадак дня для ўстойлівага развіцця да 2030» (Transforming our world: the 2030 Agenda for Sustainable Development). Праграма уключае ў сябе 17 мэтаў і 169 задач, якія закранаюць, бадай што, усе бакі існавання сучаснага чалавецтва. Праграма была прынятая ў 2015 г. ААН і ўхваленая прадстаўнікамі 193 краін свету.

«Мэты ўстойлівага развіцця» шмат у чым сугучныя «Праекту тысячагоддзя». Ініцыятыва яго стварэння ў 1996 г. належыць тром установам: Універсітэту Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, Смітсанаўскаму Музею і Міжнароднай Групе Будучыні (Futures Group International). На сённяшні дзень праект аб'ядноўвае больш за дзве з паловай тысяч удзельнікаў з усяго свету, у тым ліку навукоўцаў, бізнэсменаў, палітыкаў. Праект мае сорак філій па ўсім свеце. Бліжэйшыя да Беларусі з іх размешчаны ў Варшаве (Цэнтральна-Еўрапейская філія) і ў Ма-

скве (Расійская філія). Праект публікуе штогадовыя выданні «Сітуацыя будучыні» і «Метадалогія даследаванняў будучыні». Матэрыялы, змешчаныя ў гэтых выданнях, маюць найбольшую каштоўнасць для вывучэння глабальных праблем. Усяго вылучаецца пятнаццаць выклікаў, якія закранаюць усе сферы дзейнасці людзей.

Да даследавання глабальных праблем звяртаюцца не толькі спецыялізаваныя арганізацыі. Сярод іх асабліва трэба адзначыць Сусветны банк, які прысвяціў глабальным выклікам спецыяльны семінар. Яго матэрыялы ўяўляюць сабою добры прыклад сістэматызацыі глабальных выклікаў; яны аб'яднаныя ў пяць асноўных груп: праблемы асяроддзя і прыродных рэсурсаў, глабальныя гуманітарныя праблемы, глабальныя эканамічныя праблемы, падтрымкі міру і глабальнай бяспекі, праблемы глабальнага кіравання.

Вялікае значэнне маюць таксама і разнастайныя прыватныя ініцыятывы, напрыклад, інтэрнэт-партал «Глабатопія», «Фонд Глабальных Выклікаў», заснаваны шведскім бізнесменам венгерскага паходжання Ласла Сомбатфалві або глабальны экалагічны праект Леанарда ды Капрыа.

# МЕТАДЫЧНАЯ НАТАТКА

Вучэбны курс «Глабальныя праблемы чалавецтва» падрыхтаваны для ўмацавання і сістэматызацыі фундаментальных ведаў аб сучасным свеце ў навучэнцаў Беларускага гуманітарнага ліцэя. Мэта курса – сфарміраваць цэласнае ўяўленне аб змесце глабальных выклікаў чалавецтва ў пачатку XXI стагоддзя, асноўных шляхах іх вырашэння, а таксама – аб месцы і ролі Беларусі ў гэтым кантэксце.

Для паспяховага засваення курса навучэнцы павінны валодаць катэгарыяльным апаратам, засвоеным у працэсе вывучэння агульнай геаграфіі краін і мацерыкоў.

У выніку вывучэння курса «Глабальныя праблемы чалавецтва» навучэнцы павінны засвоіць наступныя веды і навыкі:

- ведаць змест асноўных глабальных праблем пачатку XXI стагоддзя;
- ведаць і самастойна ўжываць параметры узроўню эканамічнага развіцця для аналізу сітуацыі ў асобных краінах і рэгіёнах свету;
- ведаць галоўныя кірункі развіцця альтэрнатыўнай энергетыкі;
- ведаць асноўныя тэндэнцыі і перспектывы развіцця сусветнага рынку працы і ўплыву на яго развіцця перадавых тэхналогій;
- даваць характарыстыку асноўным кірункам рацыянальнага спажывання і выкарыстоўваць іх штодзённым жыцці;
- уяўляць асноўныя тэндэнцыі зменаў ў сацыяльнай і гендарнай няроўнасці ў пачатку XXI стагоддзя;
- ведаць асаблівасці дэмаграфічнага развіцця рэгіёнаў свету,

кірункаў міжнародных міграцый, шлях вырашэння праблемы ўцекачоў;

- арыентавацца ў тэндэнцыях сусветнай сучаснай адукацыі, у тым ліку вышэйшай;
- ведаць і ўяўляць сабе галоўныя тэндэнцыі развіцця ўрбаністыкі, шляхах вырашэння праблем сучасных гарадоў;
- быць гатовым праводзіць аргументаваную дыскусію па праблемах глабальных кліматычных зменаў;
- ведаць асаблівасці міжнародных мерапрыемстваў па захаванні біялагічнай разнастайнасці і аднаўлення экасістэм на сушы і ў сусветным акіяне;
- арыентавацца ў праблемах падтрымання глабальнага міру, спынення рэгіянальных канфліктаў, прычынах міжнароднага тэрарызму;
- быць гатовым праводзіць параўнальны аналіз значэння глабальных выклікаў для розных краін свету і, у тым ліку, Беларусі.

Структура курса заснаваная як на тыповых падыходах цэласнага вывучэння геаграфіі свету, так і на напрацоўках іншых дысцыплін: гісторыі, сацыялогіі, міжнародных адносінаў, культурнай антрапалогіі і г. д. Яна складаецца з блокаў сацыяльных і эканамічных праблем, сацыяльных і гуманітарных праблем, экалагічных выклікаў, вывучэння праблем падтрымання бяспекі. Спецыяльны раздзел прысвечаны дзейнасці міжнародных арганізацый.

На працягу курса вучням будуць прапанаваны наступныя віды самастойных работ: напісанне эсэ, выступленне з прэзентацыяй, выкананне тэстаў, удзел у дыскусіях.

Паказчыкамі засваення матэрыялаў курса будзе дэманстрацыя валодання катэгарыяльным апаратам, здольнасць да арыентацыі ў прасторы (на карце), здольнасць праводзіць параўнальны аналіз і рабіць абгрунтаваныя высновы.

# ЗМЕСТ ВЫВУЧЭННЯ КУРСА

## Частка 1. Глабальныя сацыяльныя і эканамічныя праблемы

### 1.1. Асноўныя параметры сусветнай эканомікі.

Вымярэнні эканамічнага развіцця. Універсальныя паказчыкі: валавы ўнутраны і валавы нацыянальны прадукт, індэкс чалавечага развіцця. Іншыя паказчыкі: індэкс эканамічнай свабоды, індыкатары сусветнага развіцця Сусветнага Банка, індэкс канкурэнтаздольнасці эканомікі і г. д. Месца Беларусі ў параметрах сусветных індэксаў.

Спосабы эканамічнай класіфікацыі краін свету. «Поўнач» і «Поўдзень», «Цэнтр», «Перыферыя» і «Паўперыферыя».

Нацыянальныя эканомікі і транснацыянальныя карпарацыі.

Формы міжнароднай эканамічнай інтэграцыі. Прэферэнцыяльная зона, зона вольнага гандлю, мытны саюз, агульны рынак, эканамічны і валютны саюз, поўная эканамічная інтэграцыя. Прыклады міжнароднай інтэграцыі. Еўрапейскі Саюз, НАФТА, МЕРКАСУР, БРІКС і г. д.

Змены ў структуры сусветнай эканомікі. Роля сектара высокіх тэхналогій у сусветным эканамічным развіцці.

### 1.2. Энергетычная праблема

Структура вытворчасці і спажывання энергіі ў сучасным свеце. Тэндэнцыі развіцця сусветнага энергетычнага рынку.

Мэта праграмы устойлівага развіцця ў энергетычнай сферы: забеспячэнне роўнага доступу да танных, надзейных, устойлівых, экалагічна чыстых крыніц энергіі.

Развіццё выкарыстання аднаўляльных крыніц энергіі. Ве-

травая энергетыка. Сонечная энергетыка. Геатэрмальная энергетыка. Біяэнергетыка. Праект касмічнай сонечнай энергетыкі. Энергаашчаджанне і сучасная архітэктура. Прыклады паспяховага развіцця альтэрнатыўнай энергетыкі.

### 1.3. Развіццё сучаснай інфраструктуры і індустрыялізацыя краін, якія развіваюцца.

Геаграфія сучаснай сусветнай інфраструктуры.

Сусветны транспарт. Водны транспарт. Аўтамабільны транспарт. Чыгунка. Трубаправодны транспарт. Авіяцыйныя перавозкі. Інавацыйныя праекты у сферы развіцця транспарту.

Інфармацыйная і камунікатыўная інфраструктура. Асноўныя тэндэнцыі развіцця сучаснай тэлефаніі. Кароткая гісторыя і сучаснае становішча інтэрнэт камунікацыі. Ступень ахопу інтэрнэтам насельніцтва розных рэгіёнаў свету. Праблема сапраўднасці інфармацыі ў сусветным сеціве. Базавыя прынцыпы інфармацыйнай пісьменнасці. Бяспека ў інтэрнэце. Кіберзлачыннасць і спосабы барацьбы з ёй.

Індустрыялізацыя краін, якія развіваюцца. Агульная характарыстыка эканомікі краін «перыферыі». Структура вытворчасці і занятасці. Перспектывы індустрыялізацыі асобных краін і рэгіёнаў.

### 1.4. Праблема працоўнай занятасці і інавацыйнага развіцця.

Структура занятасці сучасным свеце. Першасны, другасны, трацічны і чацвярцічны секатары занятасці.

Аплата працы. Рэгіянальныя асаблівасці занятасці і аплаты працы.

Мэты ААН па развіцця рынку працы ў краінах, якія развіваюцца.

Перспектывы занятасці ў развітых краінах свету. Раба-

тызацыя і пашырэнне сістэм штучнага інтэлекту. Праграма Індустрыя 4.0. Пагроза масавага беспрацоўя і спосабы яго пераадолення. Гарантаваны прыбытак. Прыклад увядзення гарантаванага прыбытку ў Фінляндыі. Скарачэнне працоўнага дня і працоўнага тыдня.

### 1.5. Праблемы рацыянальных спажывання і вытворчасці.

Праблема голаду ў сучасным свеце. Прычыны і памеры недастатковага спажывання харчавання. Рэгіянальныя асаблівасці пашырэння дэфіцыту харчавання. Спосабы вырашэння праблемы голаду. Міжнародныя праграмы дапамогі галадаючым.

Праблема празмернага спажывання харчавання. «Залішняя вага» як сацыяльная праблема ў развітых краінах.

Агульная характарыстыка сельскагаспадарчай вытворчасці ў сучасным свеце. Рэгіянальныя асаблівасці. Натуральная гаспадарка на перыферыі глабалізаванага свету. Суадносіны памераў вытворчасці і якасці харчавання. Праблема ўтылізацыі адыходаў харчавання.

## Частка 2. Глабальныя сацыяльныя і гуманітарныя праблемы.

### 2.1. Сацыяльная няроўнасць у сучасным свеце. Праблема беднасці.

Сацыяльная няроўнасць у гістарычным вымярэнні. Параметры выяўлення сацыяльнай няроўнасці: багацце, улада і прэстыж.

Сацыяльныя аспекты беднасці. Доступ да харчавання, адукацыі, здольнасць да самастойнага прыняцця рашэнняў. Рэгіянальныя аспекты беднасці. Самыя заможныя і самыя бедныя краіны свету. Беднасць у Азіі і Афрыцы. Праявы беднасці ў эканамічна развітых краінах.

Прагрэс у вырашэнні праблемы беднасці ў пачатку XXI стагоддзя. Асноўныя шляхі вырашэння праблемы беднасці. Міжнародныя праграмы ліквідацыі беднасці. Дабрачыннасць як міжнародны феномен.

Гендарныя аспекты сацыяльнай няроўнасці ў гістарычным і рэгіянальным кантэксце. Рэгіянальныя аспекты гендарнай няроўнасці ў сучасным свеце. Прагрэс у забеспячэнні гендарнай роўнасці ў пачатку XXI стагоддзя.

**2.2. Дэмаграфічныя праблемы сучаснасці.**

Асноўныя характарыстыкі дэмаграфічнага развіцця чалавецтва. Тры тыпы руху насельніцтва. Старэнне насельніцтва у развітых краінах. Дэмаграфічны выбух ў краінах, якія развіваюцца. Дэмаграфічны крызіс у пост-сацыялістычыных краінах Еўропы.

Міграцыі ў сучасным свеце. Асноўныя кірункі міграцыйных патокаў. Прычыны міграцый. Праблемы адаптацыі мігрантаў.

Праблема уцекачоў. Міжнародныя праграмы дапамогі ўцекачам.

**2.3. Адукацыя ў глабальным кантэксце.**

Асноўныя тэндэнцыі развіцця сучаснай адукацыі. Базавыя параметры ўзроўню адукацыі ў сусветным і рэгіянальным аспектах.

Праблема доступу да пачатковай адукацыі. Непісьменнасць у сучасным свеце. Вымярэнне якасці сучаснай сярэдняй адукацыі.

Масавая вышэйшая адукацыя як глабальны феномен. Новыя тэхналогіі ў развіцці вышэйшай адукацыі. Праблема «ўцечкі мазгоў».

Міжнародныя праграмы развіцця адукацыі. Балонскі працэс і яго вынікі.

Адукацыя на працягу жыцця.

### 2.4. Праблема развіцця гарадоў.

Гарады і гарадское насельніцтва ў сучасным свеце. Рэгіянальныя асаблівасці ўрбанізацыі. «Глабальныя» гарады.

Роля і месца гарадоў у развіцці эканомікі, навукі, адукацыі і культуры.

Праблемы ў развіцці гарадоў. Перанаселенасць, недахоп якаснага жылля, транспартныя і экалагічныя праблемы.

Асноўныя тэндэнцыя развіцця сучаснай ўрбаністыкі. «Разумныя гарады».

## Частка 3. Глабальныя праблемы захавання прыроднага асяроддзя і выкарыстання прыродных рэсурсаў.

### 3.1. Устойлівае развіццё і глабальныя кліматычныя змены.

Характар кліматычных зменаў у сучасным свеце. Парніковы эфект і глабальнае пацяпленне. Праявы глабальнага пацяплення. Павелічэнне колькасці кліматычных катаклізмаў у пачатку XXI стагоддзя.

Забруджванне асяроддзя. Асноўныя крыніцы забруджвання. Забруджванне асяроддзя ў рэгіянальным кантэксце.

Канцэпцыя ўстойлівага развіцця. Міжнародныя праграмы стрымлівання кліматычных зменаў. Кіёцкі пратакол. Парыжскае пагадненне.

### 3.2. Праблема забеспячэння прэснай вадой.

Агульная характарыстыка размеркавання крыніц прэснай вады ў сучасным свеце ў рэгіянальным кантэксце.

Структура спажывання вады. Стандарты якасці і колькасці прэснай вады.

Перспектывы пагаршэння забеспячэння прэснай вадой ў сярэднетэрміновай перспектыве. Засушлівыя рэгіёны свету.

Праекты забеспячэння прэснай вадой. Праекты развіцця санітарных паслуг.

Кіраванне воднымі рэсурсамі. Міжнародныя канфлікты з-за кантролю над воднымі рэсурсамі. Прынцыпы міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне рэгулявання доступу да водных рэсурсаў.

### 3.3. Праблема аховы і аднаўлення экасістэм сушы і біялагічнай разнастайнасці.

Галоўныя пагрозы існавання прыродных экасістэм і біялагічнай разнастайнасці.

Роля лясоў ў захаванні прыроднай разнастайнасці. Абязлесенне. Праграмы рацыянальнага лесакарыстання.

Апустыньванне. Прычыны і памеры апустыньвання. Спосабы барацьбы.

Дэградацыя зямель. Прычыны дэградацыі зямель. Дэградацыя зямель у сусветнай і рэгіянальнай перспектыве. Праекты барацьбы з дэградацыяй зямель.

Асноўныя формы захавання біялагічнай разнастайнасці. Прагрэс у захаванні біялагічнай разнастайнасці ў пачатку XXI стагоддзя.

### 3.4. Праблема захавання і рацыянальнага выкарыстання рэсурсаў сусветнага акіяна

Антрапагенны ўплыў на сусветны акіян.

Забруджванне нафтай і нафтапрадуктамі. Забруджванне хімічнымі рэчывамі.

Забруджванне цяжкімі металамі і адыходамі атамнай энергетыкі. Забруджванне цвёрдым смеццем.

Уплыў глабальнага пацяплення на біялагічную разнастайнасць сусветнага акіяну.

Міграцыі і мутацыі арганізмаў. Праблема захавання каралавых рыфаў.

Міжнародныя праграмы захавання і рацыянальнага выкарыстання біялагічнай разнастайнасці сусветнага акіяну.

## Частка 4. Праблемы глабальнай бяспекі.

### 4.1. Праблема падтрымання глабальнага міру

Сістэмы абароны ў глабальным кантэксце. Войскі і арсеналы зброі. Кантроль над звычайнымі ўзбраеннямі і нераспаўсюджанне ядзернай зброі.

Выдаткі на ўзбраенне ў сусветным і рэгіянальным аспектах. Сусветны рынак узбраенняў.

### 4.2. Рэгіянальныя канфлікты ў сучасным свеце.

Рэгіянальныя канфлікты ў пачатку XXI стагоддзя. Прычыны рэгіянальных канфліктаў. Прыклады рэгіянальных канфліктаў.

Наступствы рэгіянальных канфліктаў. Непрызнаныя дзяржаўныя ўтварэнні на мапе сучаснага свету.

Міжнародныя механізмы папярэджвання і спынення рэгіянальных канфліктаў.

### 4.3. Міжнародны тэрарызм як пагроза падтрыманню глабальнага міру.

Прычыны пашырэння міжнароднага тэрарызму. Асноўныя тэрарыстычныя арганізацыі. Аль Каеда, Талібан, Ісламская дзяржава, Бока Харам і іншыя.

Прыклады тэрарыстычных нападаў пачатку XXI стагоддзя.

Міжнародныя і нацыянальныя праграмы барацьбы з тэрарызмам.

## Частка 5. Праблемы глабальнага кіравання.

### 5.1. Арганізацыя глабальнага кіравання.

Арганізацыя Аб'яднаных Нацый. Структура ААН. Генеральны сакратар, Сакратарыят, Генеральная асамблея, Савет Бяспекі, Міжнародны суд ААН, Эканамічны і Сацыяльны Савет ААН.

Спецыяльныя міжнародныя арганізацыі. Міжнародны валютны фонд, Сусветны Банк, Сусветная Арганізацыя Аховы Здароўя, Дзіцячы фонд ААН (ЮНІСЕФ), ЮНЕСКА, ПРААН.

Дзейнасць ААН. Міратворчыя аперацыі. Аказанне гуманітарнай дапамогі.

Праграма ААН «Пераўтвараючы наш свет: парадак дня для ўстойлівага развіцця да 2030».

### Літаратура і крыніцы:


1. Арганізацыя Аб'яднаных Нацый ў Беларусі // http://un.by/by/ Рэжым доступу – 05.06.2017.
2. Геаграфія: Сусветная гаспадарка і глабальныя праблемы чалавецтва: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання А. М. Вітчанка [і інш.]. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2016.
3. Геаграфія ў тэрмінах і паняццях: Энцыклапедычны даведнік / Рэдаклегія: М. М. Курловіч і інш. - Мн.: Беларуская Энцыклапедыя, 2003 (Энцыклапедычная бібліятэчка школьніка).
4. Говард М. Сучасная культурная антрапалогія: навучальны дапаможнік. Мінск, 1995.
5. Церашковіч П. Польшча: краіна і людзі. Геаграфія Польшчы. – Мн.: Зміцер Колас, 2016.
6. ЮНИСЕФ в Беларуси // http://www.unicef.by/ Рэжым доступу – 05.06.2017.
7. Cilliffo, Anthony and Cohn, D'vera. 10 demographic trends shaping the U.S. and the world in 2017// http://www.pewresearch.

org/fact-tank/2017/04/27/10-demographic-trends-shaping-the-u-s-and-the-world-in-2017/ Рэжым доступу – 05.06.2017.
8. Global Challenges. 12 Risks that threaten human civilization// https://api.globalchallenges.org/static/wp-content/uploads/12-Risks-with-infinite-impact.pdf/ Рэжым доступу – 05.06.2017.
9. Global Issues Overview // http://www.un.org/en/sections/issues-depth/global-issues-overview/ Рэжым доступу – 05.06.2017.
10. How can sustainable development be achieved for all while addressing global climate change? // https://themp.org/#group_id=4f98b14ee3dfc62b2e000187&section=report/ Рэжым доступу – 05.06.2017.
11. How can everyone have sufficient clean water without conflict?// https://themp.org/#group_id=4f98b160e3dfc62b2e000188&section=report/ Рэжым доступу – 05.06.2017.
12. How can population and resources be brought into balance?// https://themp.org/#group_id=4f98b171e3dfc62b2e000189&section=report/Рэжым доступу – 05.06.2017.
13. How can ethical market economies be encouraged to reduce the gap between rich and poor?// 14. https://themp.org/#group_id=4f98b1b1e3dfc62b2e00018d&section=report/Рэжым доступу – 05.06.2017.
14. How can education and learning make humanity more intelligent, knowledgeable, and wise enough to address its global challenges?// https://themp.org/#group_id=521fb09295dfb59d480044bc&section=report / Рэжым доступу – 05.06.2017.
15. How can shared values and new security strategies reduce ethnic conflicts, terrorism, and the use of weapons of mass destruction?// https://themp.org/#group_id=4f98b1e7e3dfc62b2e000190&section=report /Рэжым доступу – 05.06.2017.
16. How can the changing status of women help improve the human condition?// https://themp.org/#group_id=4f98b1f4e3dfc62b2e000191&section=report/Рэжым доступу – 05.06.2017.
17. How can growing energy demands be met safely and efficiently?// https://themp.org/#group_id=4f98b210e3dfc62b2e000193&section=report/ Рэжым доступу – 05.06.2017.

18. International Monetary Fund// http://www.imf.org/external/country/BLR/rr/index.htm/ Рэжым доступу – 05.06.2017.
19. Leonardo Dicaprio Foundation // http://leonardodicaprio.org/ Рэжым доступу – 05.06.2017.
20. The Sustainable Development Agenda // http://www.un.org/sustainabledevelopment/Рэжым доступу – 05.06.2017.
21. The World Bank // http://www.worldbank.org/Рэжым доступу – 05.06.2017.
22. The Top 10 Challenges Facing Humanity// http://globaltopia.org/TOP_10_CHALLENGES.html/ Рэжым доступу – 05.06.2017.
23. UNESCO// http://en.unesco.org/Рэжым доступу – 05.06.2017.
24. United Nations Development Programme// http://www.by.undp.org/Рэжым доступу – 05.06.2017.
25. World Health Organization// http://www.euro.who.int/en/countries/belarus?language=Russian/ Рэжым доступу – 05.06.2017.

# АЎТАРСКАЯ ПРАГРАМА

вывучэння курса

## Беларускі фальклор

*у гуманітарным ліцэі*
*з беларускай мовай навучання*

Складальнік:
*Алесь Лозка,*
кандыдат гістарычных навук,
дацэнт

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ НАТАТКА

Пра этнаграфію і фальклор ў сусветнай літаратуры склалася справядлівая думка як пра рамантычныя, прыгодніцкія і гуманістычныя дысцыпліны і захапленні чалавека. Ды і ўсталёўваліся яны пераважна на голым энтузіязме, адданасці любімай справе. Гэта пазней, думаецца, з'явілася заваёўніцка-эканамічная зацікаўленасць у выкарыстанні ведаў пра іншыя народы, адкрытыя землі, танныя некранутыя багацці. У памяці ўсплываюць аўстралійскія прыгоды Міклуха-Маклая, абаронцы і заваёўнікі індзейцаў, іншых народаў, рабінзанада па Дэфо і Маўру, фантастычная зямля Саннікава і камічныя здарэнні Шурыка на Каўказе, пазнавальна-выхаваўчы і рамантычна-прыгодніцкі фальклярызм па Караткевічу і сучасны сцэнічны фальклярызм, антрапалагічныя фільмы і нацыянальнае адраджэнне…

Фалькларыстыка як навука аб фальклоры (з англ. *folklore* – народныя веды, народная мудрасць) напачатку развівалася неаддзельна ад этнаграфіі (апісанне этнасаў, народаў). Гэта потым яна вылучылася ў асобную навуку ў літаратуразнаўстве, а этналогія стала гістарычнай дысцыплінай, што вывучае народы, іх быт і культурныя традыцыі.

У сувязі з тым, што вывучэнню вуснай народнай творчасці, як дысцыпліне, якая фарміруе нацыянальны менталітэт, нацыянальныя пачуцці, надаецца недастаткова ўвагі ў сучаснай школе (асабліва пасля рэформы, калі быў скасаваны прадмет па сусветнай і айчыннай культуры, дзе добра вывучаўся фальклор), але ўсё-такі асобныя пытанні яе разглядаюцца ў школьных праграмах розных класаў (па літаратуры, гісторыі, музыцы, узноўленай праграме па мастацтве) эпізадычна, па част-

ках, то і паўстае думка аб увядзенні курса, дзе набытыя веды будуць не толькі сістэматызаваныя, але пашыраныя і паглыбленыя, абноўленыя на аснове актуальных распрацовак.

Фальклор разглядаецца як асноўны сродак народнай педагогікі, сродак навучання і выхавання, развіцця мастацкіх здольнасцяў не толькі нашых продкаў, але падаецца як дапаможнік сучаснаму беларусу. Упершыню ўключаюцца ў адукацыйны працэс матэрыялы па народнаму календару і матэматычнаму фальклору, больш увагі надаецца фальклорнаму тэатру і народным гульням.

Пасля кожнай тэмы прадстаўляюцца дапаможная літаратура і для ўзору асобныя віды практычных заняткаў. Педагог складае іх сам, зыходзячы з канкрэтных магчымасцяў, абапіраючыся на мясцовы фальклор.

Такім чынам, **мэтай** гэтага курса з’яўляецца сістэматызацыя і пашырэнне ведаў аб вуснай народнай творчасці як сродку народнай педагогікі. Да яго **задач** належаць: сістэматызацыя і пашырэнне ведаў аб фальклорных жанрах, народным календары і гульнях, фальклорным тэатры, матэматычным фальклоры і народнай педагогіцы; прышчапленне любові да свайго краю, яго багатай гістарычнай спадчыны і культурных здабыткаў, выхаванне высокіх грамадзянскіх пачуццяў.

Засвойваючы тэарэтычныя веды і набываючы першыя практычныя навыкі і ўменні ў межах гэтага курса, выпускнікі

**павінны ведаць**:

спецыфічныя асаблівасці беларускага фальклору;

спецыфіку жанраў вуснай народнай творчасці;

асноўныя паняцці і характарыстыку кожнага фальклорнага жанра;

**павінны ўмець:**

рабіць палявыя фальклорна-этнаграфічныя запісы і збор экспанатаў для краязнаўчага музея, іх пашпартызацыю;

рабіць асобныя матэматычныя вылічэнні, звязаныя з фальклорам (стары і новы стылі, год «ад стварэння свету»);

выканаць два-тры фальклорныя творы, арганізаваць народную гульню, кампетэнтна ўдзельнічаць у правядзенні свята па народных традыцыях.

Асаблівую ўвагу рэкамендуецца звярнуць на заключныя заняткі, якія павінны стаць святам, дэманстрацыяй ведаў і ўменняў навучэнцаў.

# КАРОТКІ ЗМЕСТ КУРСА

## Тэма 1. Фальклор. Асноўныя паняцці

Вусная народная творчасць. Паходжанне фальклору і яго спецыфічныя рысы: калектыўнасць, народнасць, традыцыйнасць.

Фальклор як сродак народнай педагогікі. Сістэма жанраў беларускага фальклору. Эпічныя, лірычныя і драматычныя жанры.

Запіс узораў народнай творчасці. Спосабы фіксацыі фальклорных матэрыялаў і іх пашпартызацыя.

### Літаратура


1. Арлова, Г. П. Народная педагогіка ў выхаваўчай рабоце школы / Г. П. Арлова. – Мінск: ГВЗАТ «Маладняк», 1995. – 160 с.
2. Беларуская народна-паэтычная творчасць: вучэбны дапаможнік для філалагічных факультэтаў ВНУ / В. К. Бандарчык, К. П. Кабашнікаў, М. Р. Ларчанка і інш. – Мінск: Выш. школа, 1979. – 448 с.
3. Беларускі фальклор: хрэстаматыя / скл. К. П. Кабашнікаў і інш. 4-е выд. – Мінск: Выш. шк., 1996. – 856 с.
4. Беларускі фальклор: энцыклапедыя: у 2 т. Т. 1 / рэдкал.: Г. П. Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭн, 2005. – 768 с.
5. Беларускі фальклор: энцыклапедыя: у 2 т. Т. 2 / рэдкал.: Г. П. Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭн, 2006. – 832 с.
6. Калачова, І. І. Народныя традыцыі і звычаі выхавання. Этнапедагагічная спадчына народаў Беларусі / І. І. Калачова. – Мінск: НІА, 1999. – 179 с.
7. Народная культура Беларусі: Энцыкл. давед. / пад агул. рэд. В. С. Цітова. – Мінск: БелЭн, 2002. – 432 с.

8. Народная спадчына / скл. А. С. Фядосік, Г. А. Пятроўская. – Мінск: Народная асвета, 1984. – 208 с.
9. Ракава, Л. В. Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы / Л. В. Ракава. – Мінск: Ураджай, 2000. – 111 с.

### Тэма 2. Замовы

Найбольш старадаўні жанр фальклору. Замовы пра гаспадарчую дзейнасць чалавека, магічныя тэксты ад розных хвароб і якія звязаны з сямейным і грамадскім бытам.

Месца замоўшчыкаў, чараўнікоў, знахараў, ведзьмароў, вешчуноў у жыцці чалавека.

### Літаратура

1. Беларускі фальклор: хрэстаматыя / скл. К. П. Кабашнікаў і інш. 4-е выд. – Мінск: Выш. шк., 1996. – 856 с.
2. Беларускі фальклор: энцыклапедыя: у 2 т. Т. 1 / рэдкал.: Г. П. Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭн, 2005. – 768 с.
3. Замовы / скл. Г.А. Барташэвіч. – Мінск: Беларуская навука, 1992. – 595 с. Серыя «Беларуская народная творчасць» (БНТ).
4. Казакова, І. В. Беларускі фальклор: вуч. дапам. / І. В. Казакова. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2007. – 309 с.

### Тэма 3. Народны каляндар

З гісторыі летазлічэння народаў свету і развіццё каляндарнай традыцыі на беларускіх землях. Каляндарныя эры. Сонцастаянні і раўнадзенствы. Месяцавы, сонечны, сонечна-месяцавы календары. Задыякальнае кола ў беларускай культуры. Юліянскі і грыгарыянскі календары. Ад календара Францыска Скарыны да календара «Наш край» і будучага.

Паняцце пра беларускі народны каляндар (БНК). Яго хранонімы. Унікальнасць беларускага валачобна-паэтычнага календара. У які час нашы продкі адзначалі Наваголдзе/Нава-

леццe. Каляндарны стыль і адлюстраванне яго ў валачобных песнях.

**Практычныя занняткі.**

1. Каляндарныя вылічэнні. Напрыклад, які сёння год «ад стварэння свету»? (2017 + 5508 = 7525 г.).
2. Католікі святкуюць Купалле 23 чэрвеня. Дабаўце 13 сутак і скажыце, калі адзначаюць асноўнае летняе свята праваслаўныя. Якое святкаванне бліжэй да летняга сонцастаяння?
3. У «Аповесці мінулых летаў» запісана пра самы старажытны беларускі горад: «В лето 6370. И овладел всею властью один Рюрик и стал раздавать мужам своим города – тому Полоцк, этому Ростов, другому Белоозеро». Ці праўда, што больш як 20 населеных месцаў Беларусі, пачынаючы ад Полацка да Давыд-Гарадка, неабходна лічыць старэйшымі за Маскву, якая ўпершыню згадана, як вядома, пад 1147 годам?

   *Адказ***.** Полацк з 862 года (6370–5508), значыць ён старэйшы за сталіцу Расіі на 285 гадоў. Калі параўнаць іншыя старажытныя месцы Беларусі, то выявіцца, што сапраўды больш як 20 з іх згадваюцца ў летапісах раней за 1147 год. Аднагодак Масквы – Брагін.
4. Перавядзіце 1 студзеня XVII, XVIII, XIX, XX стст. на новы стыль.

   *Адказ*. 11 (1+10), 12 (1+11), 13 (1+12), 14 (1+13) студзеня (адпаведна).
5. Перавядзіце 1 студзеня 1999 г. на стары стыль, 1899 г., 1799 г., 1699 г.

   *Адказ*. Адпаведна – 19 снежня 1998 г. (1.01.1999-13), 20 снежня 1898 г. (1.01.1899-12), 21 снежня 1798 г. (1.01.1799-11), 22 снежня 1698 г. (1.01.1699-10).

   *Літаратура для спраўджвання*. Праваслаўны царкоўны каляндар.
6. Суперкарабель «Цітанік» быў затоплены 15 красавіка 1912 г., а «Маскоўскія ведамасці» (№ 85) напісалі пра гэта 13 красавіка 1912 г. Растлумачце з’яву пра неадпаведнасць датаў.

*Адказ*. У той час Расія карысталася юліянскім календаром, а заходне-еўрапейскія краіны – сучасным, грыгарыянскім. 13 + 13 = 26, гэта значыць, што на Захадзе было 26 красавіка, амаль праз два тыдні ад трагічнага здарэння.

7. Складзіце спіс хранонімаў, якія згадваюцца ў валачобных песнях, прысвечаных гаспадару, і абазначце іх дату. (Крыніца – «Валачобныя песні» з серыі БНТ, с. 108–184).

## Літаратура


1. Беларускі народны каляндар / аўт.-уклад. А. Ю. Лозка. – Мінск: Полымя, 1993. – 205 с.
2. Беларускі праваслаўны каляндар, 2000: Звод імёнаў святых. Беларуская Праваслаўная царква напярэдадні / уклад. Т. А. Матрунчык, Г. М. Шэйкін. – Мінск: Свята-Петра-Паўлаўскі сабор г. Мінска, Беларускае Праваслаўнае Брацтва Трох Віленскіх Мучанікаў, 1999. – 160 с.
3. Валачобныя песні / уклад. Г. А. Барташэвіч, Л. М. Салавей. – Мінск: Навука і тэхніка, 1980. – 560 с.
4. Верашчагіна, А. У. Хрысціянскія святы на Беларусі: дапам. для настаўнікаў гісторыі і выкладчыкаў курса «Рэлігіязнаўства» / А. У. Верашчагіна. – Мінск: Бел. навука, 2005. – 255 с.
5. Володомонов, Н. В. Календарь: прошлое, настоящее, будущее / Н. В. Володомонов. – М.: Наука, 1987. – 80 с.
6. Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі / уклад. А. І. Гурскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 405 с.
7. Календарь в культуре народов мира: Сб. ст. – М.: Восточная литература, 1993. – 272 с.
8. Климишин, И. А. Календарь и хронология / И. А. Климишин. – 3-е изд. – М.: Наука, 1990. – 477 с.
9. Лозка, А. Ю. Беларуская фалькларыстыка: каляндар і каляндарна-абрадавая паэзія: вучэб.-метад. дапам. / А. Ю. Лозка, Н. Г. Мазурына. – Мінск: БДПУ, 2009. – 104 с.

10. Лозка, А. Ю. Беларускі народны каляндар / А. Ю. Лозка. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск: Полымя, 2002. – 239 с.
11. Лозка, А. Ю. Феномен Новага года ў беларускім фальклоры: манаграфія / А. Ю. Лозка. – Мінск: БДПУ, 2004. – 165 с.
12. Ляснічы, М. Я. З глыбінь жыватворных / М. Я. Ляснічы, К. П. Севярынец. – Мінск: Ураджай, 1990. – 149 с.
13. Ляўкоў, Э. А. Маўклівыя сведкі мінуўшчыны / Э. А. Ляўкоў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 215 с.
14. Рыбаков, Б. А. Язычество Древней Руси / Б. А. Рыбаков. – М.: Наука, 1988. – 782 с.
15. Рыбаков, Б. А. Язычество древних славян / Б. А. Рыбаков. – М.: Наука, 1981. – 607 с.
16. Толстая, С. М. Полесский народный календарь / С. М. Толстая. – М.: Индрик, 2005. – 600 с.
17. Хренов, Л. С. Время и календарь / Л. С. Хренов, И. Я. Голуб. – М.: Наука. Гл. ред. физ.-мат. лит., 1989. – 128 с.
18. Цыбульский, В. В. Лунно-солнечный календарь стран Восточной Азии / В. В. Цыбульский. – М.: Наука, 1988. – 384 с.

## Тэма 4. Каляндарна-абрадавая паэзія зімовага перыяду

Увядзенне раждзественскага Новага года (25 снежня) ў Рыме (IV ст. н. э.) і яго бытаванне ў краінах Еўропы (XIII–XIV ст.). Пераход на студзеньскі стыль. Студзеньскае Навагоддзе ў ВКЛ (з 1364 г.). Перавод справаводства канцылярыі Вялікага княства з вераснёўскага на студзеньскі стыль (з 1550 г.).

Адлюстраванне каляндарных стыляў у культуры беларускіх земляў. Усходнеславянскія калядныя традыцыі. Куцця. Культ продкаў. Калядаванне і шчадраванне. Маскіраваныя тэатралізаваныя шэсці і гульні. «Ваджэнне казы». «Яшчур». «Жаніцьба Цярэшкі».

Пiлiпаўская, калядная і масленічная паэзія.

## Практычныя заняткі.

1. Падрыхтоўка вучнёўскіх паведамленняў пра навагоднія традыцыі розных народаў свету, беларускія Каляды.
2. Вывучэнне калядных песень і абрадавых гульняў з мэтай сцэнічнага ўвасаблення.

## Літаратура


1. Гульні, забавы, ігрышчы / уст. арт., уклад., сістэм. матэр. і камент. А. Ю. Лозкі. – Мінск: Беларуская навука, 1996. – 534 с.
2. Жаніцьба Цярэшкі / уклад. тэкстаў, уступ. арт. і камент. Л. М. Салавей; уклад., сістэм. і расшыфроўка муз. матэрыялу, уступ. арт. І камент. І. Дз. Назінай. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 519 с.
3. Зімовыя песні: Калядкі і шчадроўкі / уклад. А. І. Гурскага. – Мінск: Навука і тэхніка, 1975. – 735 с.
4. Зімовыя святы: Дапам. для настаўнікаў і выхавальнікаў / аўт.-уклад. А. М. Аляхновіч, А. Ю. Лозка. – Мінск: Беларусь, 1999. – 159 с.
5. Каляндарна-абрадавая паэзія / А. С. Ліс, А. І. Гурскі, В. М. Шарая, У. М. Сівіцкі. – Мінск: Бел. навука, 2001. – 515 с.
6. Катовіч, А. Зімовыя святы: Нарысы / Аксана Катовіч, Янка Крук. – Мінск: Маст. літ., 2004. – 119 с.
7. Кухаронак, Т. І. Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў / Т. І. Кухаронак. – Мінск: Ураджай, 2001. – 239 с.
8. Лапацін, Г. І. «Ікона звалась Свячой…» Абрад «Свяча» ў прасторы традыцыйнай культуры Гомельшчыны / Г. І. Лапацін. – Гомель: Барк, 2013. – 116 с.
9. Гульні, забавы, ігрышчы / уст. арт., уклад., сістэм. матэр. і камент. А. Ю. Лозкі. – Мінск: Беларуская навука, 1996. – 534 с.

## Тэма 5. Веснавы каляндарны цыкл

Сутнасць каляндарных стыляў «сакавіцкага», «благавешчанскага», «пасхальнага», якія існавалі ў краінах Еўропы. Паняцце аб сузор'ях задыяка («жывёльны, або звярыны, круг»). Развіццё астранамічных ведаў на беларускіх землях.

Гуканне вясны. Вяснянкі і іх змест. Веснавыя карагоды і гульні. Разнастайнасць і багацце веснавога календара. Вялікдзень (Вялічка). Велікодныя песні, іх матывы. Святы і прысвяткі «рухомага» календара. Традыцыі беларускага валачобніцтва..

Благавешчанне і Саракі ў народным земляробчым коле. Сістэма БНК з жывёльнымі, птушынымі культамі. Юр'е (23 красавіка / 6 мая) – асноўнае свята жывёлы. Ярылавіца. Пастухоўскія абрадавыя гульні і звычаі. «Юраўскі (тураўскі) карагод». Асноўныя матывы беларускіх юраўскіх песень. Свята Міколы.

### Практычныя заняткі.

1. Адшукайце ў валачобных песнях радкі з асноўнымі святамі, якія распачынаюць гадавое земляробчае кола («Катораму святу наперад пайсці...»). Складзіце паэтычны каляндар на аснове велікодных песень.
2. Падрыхтуйце паведамленне аб традыцыях правядзення веснавых свят у розных рэгіёнах Беларусі.
3. Развучванне веснавых песень, карагодаў, гульняў з мэтай іх выканання.
4. Складзіце спіс свят і прысвяткаў з БНК, у якіх выяўляюцца рэшткі жывёльных і птушыных культаў (літаратура – А. Лозка «Беларускі народны каляндар»).

### Літаратура


1. Барташэвіч, Г. А. Беларуская паэзія веснавога цыкла і славянская фальклорная традыцыя / Г.А. Барташэвіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 184 с.

2. Валачобныя песні / уклад. Г. А. Барташэвіч, Л. М. Салавей. – Мінск: Навука і тэхніка, 1980. – 560 с.
3. Веснавыя песні / скл. Г. А. Барташэвіч, Л. М. Салавей; склад. муз. часткі В. І. Ялатаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1979. – 608 с.
4. Веснавыя святы: дапам. для настаўнікаў і выхавальнікаў / аўт.-уклад. А. Аляхновіч, А. Лозка. – Мінск: Беларусь, 2000. – 150 с.
5. Вянок беларускіх народных песень / зап. У. Раговіча. – Мінск: Навука і тэхніка, 1988. – 431 с.
6. Гульні, забавы, ігрышчы / уст. арт., уклад., сістэм. матэр. і камент. А. Ю. Лозкі. – Мінск: Беларуская навука, 1996. – 534 с.
7. Катовіч, А. Веснавыя святы. Нарысы. У 2 кн. Кн. І / Аксана Катовіч, Янка Крук. – Мінск: Маст. літ., 2005. – 359 с.
8. Катовіч, А. Веснавыя святы. Нарысы. У 2 кн. Кн. 2 / Аксана Катовіч, Янка Крук. – Мінск: Маст. літ., 2005. – 413 с.
9. Ліс, А. С. Валачобныя песні / А. С. Ліс. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – 207 с.
10. Ліс, А. С. Каляндарна-абрадавая творчасць беларусаў: Сістэма жанраў. Эстэтычны аспект / А. С. Ліс. – Мінск: Беларуская навука, 1998. – 188 с.
11. Лозка А. Ю. Беларускі задыякальны каляндар // Мастацтва. 2004. № 1. с. 49–51.
12. Новак, В. С. Каляндарна-абрадавая паэзія Гомельшчыны (да праблемы лакальнага, рэгіянальнага і агульнанацыянальнага ў фальклоры) / В. С. Новак. – Гомель: Установа адукацыі «Гом. дзярж. Ун-т імя Ф. Скарыны», 2001. – 232 с.
13. Паэзія беларускага земляробчага календара / уклад. А. С. Ліса. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 613 с.
14. Песні народных свят і абрадаў / уклад. і рэд. Н. С. Гілевіча. – Мінск: Выд. БДУ імя У. І. Леніна, 1974. – 462 с.

## Тэма 6. Свята летняга сонцастаяння і паэзія жніва

Пошукі чалавецтва ў адшуканні аптымальных сродкаў летазлічэння, сталай кропкі ў кругабезе дзён. Летняе сонцастаянне. Сусветнавядомы «каменны хлеў», Стоўнхендж, на паўднёвым захадзе Англіі (4000 гадоў). Падобныя мегалітычныя пабудовы ў Хакасіі, Літве, Арменіі, Расіі, на Украіне. Урочышча Камяні (Янава возера) на Полаччыне – беларускі Стоўнхендж. Першы сонечны каляндар у Егіпце (4 тысячагоддзе да н. э.).

Асноўнае свята лета – Купалле і яго язычніцкая аснова. Паэзія Купалля, асноўныя вобразы і матывы, сімволіка. Пятроўскія песні. Святы, прысвяткі і звычаі летняй пары. Ілля. Зялёныя святкі. Ваджэнне «куста». Русальны тыдзень.

Песні і абрады зажынкавыя, уласна жніўныя і дажынкавыя.

### Практычныя занняткі.

1. Правядзенне дыскусіі на тэму: «Чаму царква праследавала асноўнае свята года, дзень летняга сонцастаяння?», «Ці маглі нашы продкі адзначаць «Новы год» летам?»
2. Падрыхтоўка рэфератаў: «Англійскі і беларускі Стоўнхенджы», «Сонечны каляндар».
3. Вывучэнне і спяванне купальскіх песень і выкананне абрадавых гульняў.

### Літаратура


1. Гульні, забавы, ігрышчы / уст. арт., уклад., сістэм. матэр. і камент. А. Ю. Лозкі. – Мінск: Беларуская навука, 1996. – 534 с.
2. Жніўныя песні / склад. А. С. Ліс. – Мінск: Навука і тэхніка, 1974. – 816 с.
3. Каляндарна-абрадавая паэзія / А. С. Ліс, А. І. Гурскі, В. М. Шарая, У. М. Сівіцкі. Мн., 2001.
4. Катовіч, А.В. Летнія святы: у 2 кн. Кн. I / Аксана Катовіч, Янка Крук. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2009. – 367 с.

5. Катовіч, А.В. Летнія святы: у 2 кн. Кн. 2 / Аксана Катовіч, Янка Крук. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2009. – 368 с.
6. Купальскія і пятроўскія песні / уклад. А. С. Ліса, С. Т. Асташэвіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 631 с.
7. Ліс, А. С. Купальскія песні / А. С. Ліс. – Мінск: Навука і тэхніка, 1974. – 208 с.
8. Ліс, А. С. Беларуская каляндарна-абрадавая песня ў кантэксце фальклорных традыцый славян / А. С. Ліс. – Мінск: Беларус. навука, 2008. – 296 с.
9. Ліцьвінка, В. З. Святы і абрады беларусаў / В. З. Ліцьвінка. – 2-е выд. – Мінск: Беларусь, 1998. – 190 с.
10. Летнія святы: дапам. для настаўнікаў і выхавальнікаў / аўт.-уклад. А. Лозка. Мінск: Беларусь, 2001. – 162 с.
11. Лозка, А. Ю. Феномен Новага года ў беларускім фальклоры: манаграфія / А. Ю. Лозка. – Мінск: БДПУ, 2004. – 165 с.
12. Новак, В. С. «На граннай нядзелі русалкі сядзелі…» [Тэкст] / В. С. Новак. – Гомель: ТАА «Барк», 2005. – 244 с.
13. Сысоў, У. М. З крыніц спрадвечных / У. М. Сысоў. – Мінск: Выш. шк., 1997. – 415 с.

## Тэма 7. Восеньскія песні і абраднасць

Пачатак Новага года ў верасні з візантыйскага перыяду. Вулканаліі старажытных рымлян. 321 г. – афіцыйнае ўвядзенне святкавання пачатку новага года (з 23 верасня, затым з 1 верасня) рымскім імператарам Актавіянам Аўгустам. Каляндар Французскай рэвалюцыі. Увядзенне вераснёўскага Навалецця (каляндарнага стылю) ў Расіі (з 1493 па 1700 гг.) замест 1 сакавіка. Выкарыстанне яго ў ВКЛ побач з візантыйскім студзеньскім стылем, у «Малой падарожнай кніжцы».

Дзень Сымона – свята восеньскага Навалецця. Абрад «жаніцьбы коміна (пасьвета, лучніка)». Асноўная рытуальная песня «Ой, прыйшлі ж ночанькі доўгенькі...».

Свята Багач. Узвіжанне – легенды, звязаныя з культам змеяў. Пакроў – мяжа восені і зімы. Змітраўскія Дзяды. Семантыка і сімволіка абрадавых святаў, спалучэнне ў іх аграрных і хрысціянскіх матываў. Спецыфіка беларускіх восеньскіх песень. Матывы кахання і шлюбу. Ярынныя і льняныя песні, пры збіранні ягад, грыбоў, арэхаў. Песні на супрадках (прадзільныя). Восеньскія песні – адметная з'ява ў беларускай народна-песеннай творчасці.

Талака і талочныя песні. Гуманны звычай чалавечай узаемадапамогі на Беларусі. Песні веснавой, летняй і вясновай талокаў. Магічныя матывы і адлюстраванне гаспадарчых работ у талочных песнях.

## Практычныя заняткі.

1. Складанне сцэнарыя школьнага свята ведаў на аснове абраду «жаніцьбы коміна».

## Літаратура


1. Валодзіна, Т. М. Талака ў сістэме духоўнай культуры беларусаў / Т. М. Валодзіна; АН Беларусі. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск: Беларус. навука, 1997. – 133 с.
2. Восеньскія і талочныя песні / склад. А. С. Ліс, С. Т. Асташэвіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1981. – 679 с.
3. Восеньскія святы: дапам. для настаўнікаў і выхавальнікаў / уклад. А. Ю. Лозка; аўт. А. Лозка ды інш. – Мінск: Беларусь, 1995. – 110 с.
4. Гульні, забавы, ігрышчы / уст. арт., уклад., сістэм. матэр. і камент. А. Ю. Лозкі. – Мінск: Беларуская навука, 1996. – 534 с.
5. Лозка, А. Ю. Феномен Новага года ў беларускім фальклоры: манаграфія / А. Ю. Лозка. – Мінск: БДПУ, 2004. – 165 с.
6. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: У 6 т. – Т. І. – Магілёўскае Падняпроўе / аўт. кал.: Варфаламеева Т. Б. (нав. кір. і скл.). – Мінск: Бел. навука, 2001. – 790 с.

7. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: У 6 т. – Т. 2. – Віцебскае Падзвінне / Т. Б. Варфаламеева, А. М. Боганева, М. А. Козенка і інш. – Мінск: Бел. навука, 2004. – 910 с.
8. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: У 6 т. Т. 3. Гродзенскае Панямонне. У 2 кн. Кн.1. / В. І. Басько [і інш.]; аўт. ідэі Т. Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск: Выш. шк., 2006. – 608 с.

## Тэма 8. Сямейная абрадава-паэтычная творчасць

Радзінныя звычаі і абрады, звязаныя з нараджэннем дзіцяці. Радзіны (хрэсьбіны, хрысьціны, ксьціны). Імянарачэнне. «Бабіна каша». Зычэнні. Абмен падарункамі. Абрад «цягання бабы на баране». Абрады і звычаі першага кроку, слова, з'яўлення першага зуба, пастрыжэння. Радзінная паэзія – адметная рыса беларускага фальклору. Заклінальныя, велічальныя, жартоўныя і застольныя песні. Вобразы дзіцяці, парадзіхі, бабкі, бацькі.

Паходжанне вясельнага абраду і яго сутнасць. Этапы вяселля: сватанне, заручыны, каравай, зборная субота, пасад, расплятанне касы, выезд маладога, вянчанне, вяселле ў маладога і маладой, пярэзвы і інш. Адлюстраванне рэштказ старажытных вераванняў, формаў шлюбу. Роля хлеба на вяселлі. Багацце вясельных песень. Іх тэматычны змест. Сіроцкія матывы.

Паходжанне галашэнняў і абрадаў. Іх сувязь з вераваннямі. Смерць чалавека і рытуальныя дзеянні, звязаныя з яго пахаваннем. Цыклы галашэнняў і іх змест. Галашэнні па бацьку, маці, мужу, сыну, дачцы, дзеду.

## Практычныя заняткі

1. Запішыце рэдкія імёны вашай мясцовасці і дайце спробу іх тлумачэння (хрысціянскае, мясцовае, ці іншае паходжанне). *Напрыклад*, Кім – Камуністычны інтэрнацыянал моладзі; Варлен – У (в) армію Леніна; Марлен – Маркс, Ленін; Луіджы –

«Ленин умер, но идеи живы»; Віль – У (В). І. Ленін; Лапанальда – лагер папанінцаў на (і)льдзіне; Фэд – Фелікс Эдмундавіч Дзяржынскі.

2. Напішыце радавод сваёй сям'і.
3. Апытванне дарослых, якія яны ведаюць традыцыйныя вясельныя чыны і што яны азначаюць, або выпісванне іх з тэкстаў абрадавых песень (маршалак, дружка, каравайніца, сват, музыка, свяцёлка, пасцельніца, завівальніца, прыданкі, заручнікі, падстрыжанка, кубельнік і інш.).
4. Запішыце вясельныя тосты, зычэнні.
5. Складзіце лібрэта каравайнага абраду.
6. Наведайце мясцовыя могілкі. Выяўленне найбольш старадаўніх пахаванняў, традыцыі месца ўстаноўкі крыжа (у галаве, нагах).
7. Апытанне дарослых аб традыцыях правядзення Радаўніцы, Дзядоў.

## Літаратура


1. Вяселле: Абрад / склад. К. Цвірка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1978. – 640 с.
2. Вяселле: Песні / склад. Л. А. Малаш. – Мінск: Навука і тэхніка, 1980–1988.
3. Гульні, забавы, ігрышчы / уст. арт., уклад., сістэм. матэр. і камент. А. Ю. Лозкі. – Мінск: Беларуская навука, 1996. – 534 с.
4. Кухаронак Т. І. Радзінныя звычаі і абрады беларусаў: канец XIX–XX ст. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993.
5. Лірыка беларускага вяселля / уклад. і рэд. Н. С. Гілевіча. Мн., 1979.
6. Лозка, А. Ю. Беларуская фальклорыстыка: Народныя гульні: вучэб.-метад. дапам. / А. Ю. Лозка, А. В. Дрыгін. – Мінск: БДПУ, 2012. – 176 с.
7. Пахаванні. Памінкі. Галашэнні / уклад. У. А. Васілевіч, Т. Б. Варфаламеева. – Мінск: Навука і тэхніка, 1986. – 615 с.
8. Радзінная паэзія / Склад. М. Я. Грынблат, В. І. Ялатаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1971. – 784 с.

9. Радзіны: Абрад. Песні / Уклад. Г. А. Пятроўская, Т. І .Кухаронак. – Мінск: Навука і тэхніка, 1998.
10. Сысоў У. М. Беларуская пахавальная абраднасць: Структура абраду, галашэнні, функцыі слова і дзеяння. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 182 с.
11. Сямейна-абрадавая паэзія. Народны тэатр / А. С. Фядосік і інш. – Мінск: Бел. навука, 2001. – 422 с.

## Тэма 9. Пазаабрадавы паэтычны фальклор

Асаблівасці гістарычнай песні, яе сувязь з баладай. Адлюстраванне ў песнях барацьбы народа з яго ворагамі (татарамангольскае нашэсце, турэцкі палон, Аршанская бітва, вайна 1812, 1941–1945 гг.).

Азначэнне жанру балад і іх паходжанне. Класіфікацыя (балады з міфалагічнымі матывамі, казачныя і легендарныя, балады-загадкі, гульнёва-карагоднага складу, навелістычныя). Асноўныя сюжэты і матывы.

Сацыяльна-бытавыя песні. Творчасць сялян, якія займаліся адыходніцкім рамяством. Нядоля, жабрацтва, несправядлівасць як асноўная тэма песень. Антыпрыгонніцкі матыў. Паднявольная праца селяніна, жорсткая эксплуатацыя яго панам, папом і падпанкамі. Гора і нядоля ў антыпрыгонніцкіх песнях. Рэкруцкія, салдацкія і казацкія песні. Набор у рэкруты, паказ розных этапаў салдацкай службы, зварот да хаты, смерць, асуджэнне вайны і несправядлівасці – тэмы салдацкіх песень. Бурлацкія (стругоўскія), чумацкія і батрацкія песні. Іх асаблівасці ў Беларусі.

Спецыфіка любоўных песень. Вобразы дзяўчыны і хлопца. Паэтызацыя пачуцця кахання, асуджэнне здрады. Народная мараль і этыка ў любоўных песнях.

Сямейна-бытавыя песні. Жыццё замужняй жанчыны ў чужой сям'і. Тэматыка песень: гаротны замуж, успамін пра бацькоўскі дом і мару пра сустрэчу з роднымі, сям'я мужа

і яе адносіны да нявесткі, няўдалы і дэспатычны муж, жонка-няўдаліца, удовіны і сірочыя песні.

Асаблівасці жартоўных і сатырычных песень. Паказ іх вобразаў: недарэчнага мужа, няўдалай жонкі, іншых членаў сям'і, высмейванне розных заганаў у характары і паводзінах людзей. Песні пра жывёл, звяроў, птушак і насякомых. Сацыяльныя матывы ў жартоўных песнях.

Прыпеўкі. Паняцце жанру. Каханне як асноўная тэма прыпевак. Бытавыя матывы. Сатыра і гумар. Вялікая Айчынная вайна ў прыпеўках. Лёс прыпеўкі ў наш час. Прыпеўкі літаратурнага паходжання, аўтарскія і самадзейныя.

### Практычныя заняткі

1. Складанне зборніка загадак на аснове балад-загадак.
2. Конкурс чытальнікаў народных і літаратурных балад.
3. Праслухоўванне запісаў пазаабрадавых песень і іх развучванне.
4. Конкурс на лепшага выканаўца ці складальніка прыпевак.

### Літаратура


1. Аляхновіч, А. М. Народная песня ў школе: дапам. для настаўнікаў музыкі і спеваў, кл. кіраўнікоў, выхавальнікаў / А. М. Аляхновіч. – Мінск: Беларусь, 2004. – 171 с.
2. Балады. У дзвюх кн. Кн. 1 / Склад. Л. М. Салавей. – Мінск: Навука і тэхніка, 1977. – 784 с.
3. Вянок беларускіх песень / зап. У. Раговіч. Мн., 1988.
4. Жартоўныя песні / склад. І. К. Цішчанка, С. Г. Нісневіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1974. – 728 с.
5. Прыпеўкі / уклад. І. К. Цішчанка, Л. М. Фёдараў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – 432 с.
6. Фядосік А. С. Трапным народным словам. Мн., 1971.
7. Лірычныя песні / уклад. і рэд. Н. С. Гілевіча. Мн., 1976. – 464 с.
8. Песні пра каханне / склад. І. К. Цішчанка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1978. – 616 с.

9. Сямейна-бытавыя песні / склад. І. К. Цішчанка, Г. В. Таўлай. – Мінск: Навука і тэхніка, 1984. – 752 с.
10. Пазаабрадавая паэзія / А. І. Гурскі, Г. А. Пятроўская, Л. М. Салавей. Мн., 2002.
11. Сацыяльна-бытавыя песні / уклад. І. К. Цішчанка, Г. В. Таўлай. – Мінск: Навука і тэхніка, 1987. – 488 с.

## Тэма 10. Фальклорная проза

Фальклорныя празаічныя жанры. Казкавая і няказкавая проза. Азначэнне жанру казкі. Суадносіны выдумкі і рэчаіснасці ў казках. Казкі пра жывёл. Асноўныя тэмы, ідэі і вобразы. Выхаваўчая роля казак. Характарыстыка чарадзейных (чарадзейна-фантастычных) казак, іх асноўныя вобразы і тэмы. Цудадзейныя прадметы: дыван-самалёт, боты-самаходы, самапітны збан і г. д. Бытавыя і авантурна-навелістычныя казкі. Паходжанне і змест бытавых казак. Сацыяльная накіраванасць. Паказ адмоўных з'яў і якасцяў чалавека. Асноўныя героі. Вобраз дурня і інш. Аснова сюжэта авантурна-навелістынай казкі – прыгоды героя. Змешаныя (сінтэтычныя) формы казак: легендарная казка, анекдатычная казка, гістарычна-тапанімічная легенда.

Легенды. Межы легендарнага, фантастычнага і рэалістычнага ў няказкавай прозе. Легенды этыялагічныя або касмаганічныя (пра паходжанне свету, нябесных свяціл, зямлі, чалавека, жывёл, раслін і іншых з'яў прыроды); этнасацыяльныя або гісторыка-культурныя (пра паходжанне плямён, народаў, класаў і розных сацыяльных і культурных з'яў); духоўна-этычныя (пра Бога і святых, паходжанне свят, пра розныя вераванні). Легенды Вялікай Айчыннай вайны.

Жанр падання. Суадносіны эстэтычнай і пазнавальнай функцый. Паданні гістарычныя (пра войны і нашэсці, гістарычныя асобы, эпідэміі, моры і г. д.); тапанімічныя (пра

паходжанне гарадоў, вёсак, урочышчаў, рэк, азёр, камянёў, прозвішчаў, мянушак); пра заклятыя скарбы.

Вусныя сказы (апавяданні-ўспаміны, мемуары).

Смехавыя формы прозы. Небыліца як жанр казкі. Месца хлусні і абсурднасці сітуацыі ў структуры твора. Анекдатычныя казкі. Персанажы твораў (дурань, хітры ці прастадушны злодзей). Гратэск і метафара – структураўтваральныя сродкі анекдатычнай казкі.

Анекдот (показка) як жанр і яго паходжанне. Адрозненне ад казкі. Гістарычныя падзеі і асобы ў анекдотах. Сатыра і гумар. Ідэйна-тэматычны змест і мастацкія асаблівасці анекдотаў. Роля камічнай развязкі, дыялогу і гульні слоў. Значэнне анекдота ў сучасным жыцці.

Жарты і досціпы (гумарэскі), іх мастацкія асаблівасці. Незласлівасць, дасціпнасць насмешкі ў жартах.

### Практычныя заняткі

1. Запіс казак, легенд і паданняў.
2. Правядзенне міні-экспедыцыі па выяўленні тапанімічных назваў сваёй вёскі, пасёлка, вуліцы і г.д.
3. Сустрэча з ветэранам вайны. Запіс апавяданняў-успамінаў.
4. Конкурс на лепшага выканаўцы твораў гумару і сатыры.

### Літаратура


1. Беларускія народныя казкі / склад. Г. А. Барташэвіч, К. П. Кабашнікаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1986. – 512 с.
2. Жарты, анекдоты, гумарэскі / скл. А. С. Фядосік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1984. – 438 с.
3. Казкі ў сучасных запісах / уклад. К. П. Кабашнікаў, Г. А. Барташэвіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – 663 с.
4. Легенды і паданні / склад. М. Я. Грынблат, А. І. Гурскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1983. – 543 с.

5. Народныя казкі-байкі, апавяданні і мудраслоўі / уклад. і рэд. Н. С. Гілевіча. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1983. – 350 с.
6. Ненадавец, А. М. За смугою міфа / А. М. Ненадавец. – Мінск: Беларуская навука, 1999. – 254 с.
7. Ненадавец, А. М. Каму пакланяліся продкі / А. М. Ненадавец. – Мінск: Навука і тэхніка , 1996. – 235 с.
8. Ненадавец, А. М. Пакланіцеся дубу / А. М. Ненадавец. – Мінск: Полымя, 1992. – 110 с.
9. Ненадавец, А. М. Святло таямнічага вогнішча / А. М. Ненадавец. – Мінск: Беларусь, 1993. – 287 с.

## Тэма 11. Малыя жанры фальклору

Паняцце пра малыя жанры вуснай народнай творчасці і іх паходжанне. Выслоўі. Разнавіднасці выслоўяў (мудраслоўяў) і іх тыпалогія. Сувязь з фразеалагізмамі, прымаўкамі і прыказкамі. Месца жарту і каламбура. Прыгаворкі-зычэнні на вяселлі, віншаванні, пажаданні, тосты. Народныя параўнанні і прыкметы. Прысяганні, праклёны і ганьбаванні. Дражнілкі-кепікі. Выкарыстанне выслоўяў у літаратурнай творчасці.

Адрозненне прыказак і прымавак, прымавак і фразеалагізмаў. Іх паходжанне і асаблівасці бытавання. Сацыяльныя матывы і тэматыка.

Азначэнне загадак і іх паходжанне. Месца загадкі ў жыцці народа. Віды загадак (пытанні, жарты, задачы), іх ідэйнатэматычныя групы.

### Практычныя заняткі

1. Запішыце ад бацькоў і знаёмых розныя віды выслоўяў.
2. Складанне шэрагу лепшых 10 твораў у намінацыях «Устойлівы дасціпны выраз», «Вясельнае пажаданне», «Праклён», «Параўнанне», «Ветлівае выслоўе (добраслоўе)» па томе «Выслоўі» (серыя «Беларуская народная творчасць»).

3. Гутарка па тэме «Выкарыстанне праклёнаў у літаратурнай творчасці» (паэзія Янкі Купалы, Гальяша Леўчыка, Ніла Гілевіча і інш.).
4. Конкурс на лепшага знаўца прыказак і прымавак (хто больш назаве фальклорных твораў па вызначанай настаўнікам тэматыцы).

## Літаратура


1. Загадкі / склад.М. Я. Грынблат, А. І. Гурскі. – Мінск: Беларуская навука, 2004. – 363 с.
2. Казакова, І. В. Беларускі фальклор: вуч. дапам. / І. В. Казакова. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2007. – 309 с.
3. Народныя казкі-байкі, апавяданні і мудраслоўі / уклад. і рэд. Н. С. Гілевіча. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1983. – 350 с.
4. Прыказкі і прымаўкі: у 2 кн. Кн. 2. / склад. М. Я. Грынблат. – Мінск: Навука і тэхніка, 1978. – 599 с.
5. Прыказкі і прымаўкі: у 2 кн. Кн. 1. / склад. М. Я. Грынблат. – Мінск: Навука і тэхніка, 1976. – 616 с.
6. Зямля стаіць пасярод свету… Беларускія народныя прыкметы і павер'і / уклад. У. Васілевіча. – Мінск: Маст. літ., 1996. – Кн. 1. – 591 с.


## Тэма 12. Фальклорны тэатр

Фальклорны тэатр (народны, традыцыйны тэатр). Абрады, гульні, карагоды, святы, батлейка – віды відовішчнагульнёвай культуры народа. Адрозненне народнага тэатра ад прафесійнага.

Гісторыя батлеечнага тэатра. Віды тэатральных скрынак і іх афармленне. Лялька-персанаж на шпяні.

Асноўны рэпертуар лялечнага тэатра. Варыятыўнасць містэрыяльнай драмы «Цар Ірад». Сістэма вобразаў. Сюжэты і вобразнасць драм «Лодка» і «Цар Максімільян». Малыя фор-

мы драматычных твораў. Інтэрмедыі. Камедыйнасць, сатыра, адлюстраванне народнага жыцця ў кароткіх бытавых сцэнах. «Жывая батлея» і яе рэпертуар.

### Практычныя заняткі

1. Выраб лялькі-персанажа батлеечнага тэатра.
2. Праца над спектаклем «Цар Ірад», ці «Дзіва божага нараджэння». Практычнае авалоданне праз рэпетыцыйныя заняткі майстэрствам ваджэння лялек у батлейцы.
3. Інсцэніроўка кароткай беларускай казкі, падання, жарту і іх тэатралізацыя.

### Літаратура


1. Народны тэатр / склад. М. А. Каладзінскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1983. – 512 с.
2. Тэатр лялек: дапам. для выхавальнікаў дашк. устаноў / пад рэд. А. Ю. Лозкі. – Мінск: Полымя, 1998. – 203 с.
3. Барышаў Г. І., Саннікаў А. К. Беларускі народны тэатр батлейка. Мн., 1962.
4. Лозка, А. Ю. Беларуская батлейка. Каляндарныя і абрадавыя гульні: дапам. для настаўнікаў, выхавальнікаў, кіраўнікоў гурткоў / А. Ю. Лозка. – Мінск: Тэхналогія, 1997. – 183 с.
5. Лозка, А. Ю. Беларукая фальклярыстыка: Традыцыйны тэатр: вуч.-метад. дапам. / А. Ю. Лозка. – Мінск: БДПУ, 2009. – 56 с.
6. Сямейна-абрадавая паэзія. Народны тэатр / А. С. Фядосік і інш. – Мінск: Бел. навука, 2001. – 422 с.
7. Тэатралізаваныя школьныя святы / аўтары-склад. А. Ю. Лозка, І. І. Кірчук. – Мінск: БелЭн, 2004. – 176 с.

## Тэма 13. Дзіцячы фальклор

Народная творчасць дарослых для дзяцей як сродак народнай педагогікі. Прыказкі і прымаўкі. Загадкі. Казкі, легенды і паданні. Танцы.

Творчасць саміх дзяцей. Песенныя, вершаваныя і празаічныя жанры дзіцячага фальклору. Гульнёвыя жанры (гульні, забавы, забаўлянкі, карагоды, лічылкі, жараб'ёвыя загаворы, скорагаворкі (хуткамоўкі, вымаўлянкі), маўчанкі). Негульнёвыя жанры (калыханкі, пацешкі, песні, заклічкі, прыгаворкі, дражнілкі, прыпеўкі, жарты, загадкі, казкі, страшылкі).

### Літаратура

1. Барташэвіч Г. А. Вершаваныя жанры беларускага дзіцячага фальклору. Мн., 1976.
2. Беларускі дзіцячы фальклор: традыц. запісы, апрацоўкі і аўт. творы / скл. А. М. Аляхновіч, М. В. Рахчэеў, А. С. Фядосік, У. Д. Каструлёў. – Мінск: Беларусь, 1994. – 271 с.
3. Беларускі фальклор у школе: 1-ы клас; дапам. для настаўніка / І. І. Сучкоў [і інш.]. – Мінск: Нар. асвета, 1996. – 176 с.
4. Беларускі фальклор у школе: 2-гі клас; дапам. для настаўніка / аўт.-уклад.: І. І. Сучкоў [і інш.]. – Мінск: Беларусь, 2000. – 174 с.
5. Гульні, забавы, ігрышчы / уст. арт., уклад., сістэм. матэр. і камент. А. Ю. Лозкі. – Мінск: Беларуская навука, 1996. – 534 с.
6. Дзіцячы фальклор / скл. Г. А. Барташэвіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1972. – 736 с.
7. Дзіцячы фальклор: зборнік фальклорных матэрыялаў / нав. рэд. У. А. Васілевіч. – Мінск: БДПУ, 2006.
8. Лозка, А. Ю. Беларуская фалькларыстыка: Народныя гульні: вучэб.-метад. дапам. / А. Ю. Лозка, А. В. Дрыгін. – Мінск: БДПУ, 2012. – 176 с.

## Тэма 14. Народныя гульні і забавы, харэаграфічны фальклор

Паняцці аб народных гульнях, забавах, забаўлянках, пацешках.

Гульні каляндарнага і сямейна-абрадавага цыклаў.

Гульні, не звязаныя з календаром і абрадамі (ці згубілі сувязь). Гульні з інвентаром (палкамі, мячом, іншымі прадметамі), або без яго (звязаны з бегам, лоўляю і пошукам; з элементамі барацьбы ці іншымі сілавымі прыёмамі; з дзеяннямі, якія патрабуюць наглядальнасці, кемлівасці і іншых якасцяў; з перавагаю элементаў інтэрмедыі, харэаграфіі, імітацыі.

Віды народных карагодаў. Карагодныя і танцавальныя песні, іх сувязь з абрадамі і пазаабрадавай творчасцю народа. «Яшчур», «Падушачка», «Перапёлачка», «Проса», «Мак», «Лянок».

Танцы-гульні («Зайчык», «Мяцеліца», «Падушачка»).

Народныя танцы, абрадавыя і пазаабрадавыя, гуртавыя, парныя і сольныя. Танцы з няцотнай колькасцю ўдзельнікаў «Лявоніха тройкамі», «Кракавяк тройкамі», полькі «Тройка», «Кружэчок», «Месяц». Даўнейшыя «Мяцеліца», «Лявоніха», працоўныя «Лянок», «Таўкачыкі», «Церніца», запазычаныя «Барыня», «Нарэчанька», «Каробачка», «Кракавяк», «Кадрыля», гарадскія «Падэспань», «Матлёт».

### Практычныя заняткі

1. У адпаведных тамах і зборніках фальклору падбярыце і правядзіце гульні, звязаныя з сілавымі прыёмамі. Растлумачце, якое значэнне яны маюць у фізічным выхаванні асобы.
2. Развучванне гульняў, карагодаў і танцаў (на выбар).

## Літаратура


1. Гульні, забавы, ігрышчы / скл. А. Ю. Лозка. – Мінск: Беларуская навука, 1996; 2-е выд., 2000; 3-е выд. 2003. – 534 с.
2. Лозка, А. Ю. Беларуская фальклmagрыстыка: каляндар і каляндарна-абрадавая паэзія: вучэб.-метад. дапам. / А. Ю. Лозка, Н. Г. Мазурына. – Мінск: БДПУ, 2009. – 104 с.
3. Лозка, А. Ю. Беларуская фальклmagрыстыка: Народныя гульні: вучэб.-метад. дапам. / А. Ю. Лозка, А. В. Дрыгін. – Мінск: БДПУ, 2012. – 176 с.
4. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: У 6 т. Т. 4. Брэсцкае Палессе. У 2 кн. Кн. 1. / В. І. Басько [і інш.]; ідэя і агул. рэдагаванне Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск: Выш. шк., 2008. – 559 с.
5. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: У 6 т. Т. 5. Цэнтральная Беларусь. У 2 кн. Кн. 1. / В. І. Басько [і інш.]; ідэя і агул. рэдагаванне Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск: Выш. шк., 2010. – 847 с.
6. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: У 6 т. Т. 6. Гомельскае Палессе і Падняпроўе. У 2 кн. Кн. 1. / Т. В. Валодзіна [і інш.]; ідэя і агул. рэдагаванне Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск: Выш. шк., 2012. – 910 с.


## Тэма 15. Матэматычны фальклор

Фальклорны матэрыял па развіцці інтарэса ў дзяцей да матэматыкі, фарміравання элементарных матэматычных уяўленняў, развіцця вобразнага і лагічнага мыслення. Сродкі народнай педагогікі: лічылкі, гульні, калыханкі, песенькі, песні-загадкі, жарты, казкі, прыказкі, прымаўкі, загадкі, загадкі-задачы.

## Практычныя заняткі

1. Падбярыце прыказкі і прымаўкі, лічылкі ў паступовай лічбавай градацыі ад трох да дзесяці.

2. Прыдумайце па наступнай аналогіі найпрасцейшыя матэматычныя заданні, выкарыстоўваючы розныя народныя песні, забаўлянкі, лічылкі, гульні:

***Забаўлянка***

Гоп-гоп, і-га-га.
На буланцы едзець Янка,
Паўтараста рублей санкі,
Пяцьдзясят рублей дуга,
А кабылка паўрубля.
Гоп-гоп, і-га-га.

(*Зап. у 1971 г. у в. Закор'е Браслаўскага раёна Віцебскай вобл. ад Валі Паўловіч, 12 год*).

Падлічыце, якой маёмасцю валодае Янка? (Дзвесце рублёў з паловаю).

3. Рашыце задачы, запісаныя ў вёсках Беларусі.

- Падзяліць сорак коней у дзевяць стайняў, каб не было пароўну. (У чатырох стайнях па 5 коней, а ў пяці – па 4). Хойніцкі р-н.
- За сто рублёў купіць сто штук быдла: валы па дзесяць рублёў, каровы па пяць, падцёлкі па паўрубля.
(*Вол – 1, кароў – 9, падцёлкаў – 90*). Слонімскі павет.
- Ляцеў статак гусей. Насустрач яму адна гусь:
– Добры дзень, сто гусей!
– Нас не сто гусей. Каб нас было яшчэ столькі, паўстолькі, чвэрць столькі і ты, адна гусь, тады было б сто гусей. Колькі ляцела гусей? (Трыццаць шэсць гусей). Капаткевіцкі р-н.
- Дваццаць без пятнаццаці, трох не далажыўшы, двух не далічыўшы. Колькі будзе? (Нічога).
- На дрэве сядзела адзінаццаць курапатак. Паляўнічы ў адну птушку пацэліў з першага стрэлу. Колькі курапатак засталося на дрэве? (Нікольки, разляцеліся).

Іншыя задачы ў дапаможніку «Матэматычны фальклор».

## Літаратура


1. Дзіцячы фальклор / скл. Г. А. Барташэвіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1972. – 736 с.
2. Матэматычны фальклор: пачатковыя матэматычныя ўяўленні і навыкі сродкамі народнай педагогікі / аўт.-скл. А. Лозка. – Мінск: ТБШ, 2002. – 52 с.
3. Народная спадчына / скл. А. С. Фядосік, Г. А. Пятроўская. – Мінск: Народная асвета, 1984. – 208 с.


## Тэма 16. Падагульняльныя заняткі

Форма правядзення на выбар настаўніка: палявая экспедыцыя ў вёску з мэтай запісу фальклорных узораў; канцэрт на аснове вывучаных твораў; Беларусіяда: культурна-спартыўнае свята; удзел у падрыхтоўцы свята народнага календара; паказ батлеечнага спектакля; канферэнцыя па вучнёўскіх пісьмовых работах і г. д.

# ЗМЕСТ

Аўтарская праграма вывучэння курса
«Літаратура і мастацтва»........................................................ 3
Аўтарская праграма вывучэння курса
«Геаграфія (глабальныя праблемы чалавецтва)» ............. 51
Аўтарская праграма вывучэння курса
«Беларускі фальклор» ........................................................ 67

Даведачнае выданне

**Літаратура і мастацтва**
**Геаграфія**
**Беларускі фальклор**

*Эксперыментальныя аўтарскія праграмы гуманітарнага ліцэя*

Для ўнутранага карыстання
ў грамадскай арганізацыі

Падпісана да друку 16.06.2017. Фармат 60×84 $^1/_{16}$.
Папера афсетная. Друк лічбавы.
Ул.-выд. арк. 3,24. Ум. друк. арк. 5,70.
Наклад 99 асобнікаў.

Надрукавана на офісным абсталяванні
Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне
«Таварыства беларускай школы»